PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 14 (2447) Год XLVIII | Беласток, 6 красавіка 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Што чакае сялян у Еўрасаюзе?

Размова з Міколам ЯНОЎСКІМ, кіраўніком Павятовага бюро Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ў Гайнаўцы.

— У ліпені мінулага года ўзнікла Гайнаўскае бюро Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі. Што ўдалося сарганізаваць Вам?

— Мы ўжо пасля рамонту памяшканняў бюро, якое знаходзіцца ў будынку распаложаным па вуліцы Пілсудскага 10. Зараз працуе ў нас 7 асоб, але будзем яшчэ прымаць новых працаўнікоў. Першай нашай задачай было вешанне навушнікаў-ідэнтыфікатараў для жывёлы. Зараз набліжаемся да завяршэння гэтай працы. Хутка гаспадары атрымаюць для кароў пашпарты, а разам з імі перададуць нумары для гаспадарак. Гаспадары атрымалі ўжо кнігі рэгістрацыі жывёлы і пасведчанні аб яе прыналежнасці, дзе будуць апісваць гісторыі жыцця кароў.

— Што будзеце рабіць зараз?

— Будзем займацца рэгістрацыяй свіней, авечак, коз і коней. Авечак і коз будзем кальцаваць, уласнікі коней атрымаюць пашпарты, а свінням зробім татуіроўку (з 1 чэрвеня — бясплатна). Інфармацыя пра хатнюю жывёлу будзе ўведзена ў камп'ютэрную базу даных. Ствараем інтэграваную сістэму кіравання і кантролю, у якую будуць уведзены даныя аб ворыве, лугах і жывёле. Павінна яна быць завершана да канца года. Пасля будуць выкананы фотакарты палёў і лугоў, якія будзем параўноўваць з нашымі данымі. Усё гэта неабходнае гаспадарам для атрымання даплаты да сельскагаспадарчай прадукцыі ў выпадку ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз.

— Ці вядома на якія сродкі могуць разлічваць сяляне?

— У выпадку лугоў у 2004 годзе гаспадары атрымаюць з Еўрасаюза па 161 зл. падставовых даплат да гектара зямлі, 65 зл. дадатку і 116 зл. з дзяржаўнага бюджэту, калі ўрад выдзеліць адпаведныя сродкі. У 2005 годзе павінна быць разам 424 зл. даплат, а ў 2006 годзе — 513 зл. Калі будзе расці збожжа, матыльковыя або алеістыя расліны, то гаспадары атрымаюць да кожнага гектара зямлі даплату размерам 442 зл. у 2004 годзе, 483 зл. у 2005 годзе і 523 зл. у 2006 годзе. Для поля, на якім будуць расці буракі, бульба, агародніна або зямля будзе ляжаць паранінай можна будзе атрымаць толькі падставовыя даплаты з Еўрасаюза — па 161 зл. у 2004 годзе, 199 зл. у 2005 годзе і 238 зл. у 2006 годзе.

— Аднак польскі ўрад можа не рашыцца на самыя высокія даплаты.

— Думаю, што рашыцца.

[працяг ☞ 3]

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вучні з I „а" класа гайнаўскага белліцэя

Угодкі ў Гайнаўцы

Аляксей МАРОЗ

У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы 85-я ўгодкі Беларускай Народнай Рэспублікі святкаваліся 25 сакавіка. З самай раніцы на калідорах расклеены былі бел-чырвона-белыя сцягі, гербы „Пагоня" і інфармацыі на беларускай мове пра абвяшчэнне незалежнасці Беларусі. Вучні наладзілі дзве ўрачыстыя лінейкі з мастацка-музычнымі мантажамі. Пра падзеі 1918 года вучні размаўлялі на ўроках беларускай мовы і гісторыі.

Перад белгімназістамі ў актавым зале выступілі вучні з II „б" класа. У час кароткай сцэнкі прадставілі яны гістарычныя падзеі, якія адбыліся ў сакавіку 1918 года. Дэкламавалі патрыятычныя вершы і спявалі песні пад акампанемент акардэона і гітары. Сола выступіла Амэлія Горбач. Лінейка закончылася песняй „Люблю наш край, старонку гэту". Настаўніца беларускай мовы Вольга Сянкевіч, якая наглядала за падрыхтоўкай гімназістаў да выступлення сказала, што перад школьным мерапрыемствам вучні знаёміліся дакладней са святам Дня волі.

— 25 Сакавіка — самае вялікае беларускае свята. У 1918 годзе Беларусь стала незалежнай дзяржавай, — сказаў Норберт Васілюк. — Пра гэта даведаўся я толькі ў гімназіі. Раней ніхто аб гэтым не гаварыў.

Яго сябра Андрэй Грыгарук кажа, што аб абвяшчэнні незалежнасці Беларусі даведаўся яшчэ ў падставовай школе. Аднак дакладней расказалі аб сакавіцкіх падзеях ужо ў белгімназіі.

— Калі была я ў першым класе не звяртала асаблівай увагі на сакавіцкае святкаванне. Зараз, калі рыхтавалі мы лінейку, зразумела чаму гэтае свята такое важнае для беларусаў, — гаворыць Магдаліна Чыквін.

Белліцэісты ў час лінейкі таксама расказвалі пра гістарычныя падзеі і чыталі патрыятычныя вершы. Музычную частку падрыхтаваў калектыў „Знічка" і яго апякунка Бажэна Ляўчук. Дзяўчаты заспявалі лірычныя песні са свайго

[працяг ☞ 3]

Дзень надзеі

Часта чуем пытанні, чаму мы, беларусы, святкуем чарговыя ўгодкі Акту 25 Сакавіка 1918 г.? Ці ж зараз у гэтым сканфліктаваным і падзеленым свеце не лепш забыць пра мінуўшчыну і згодна з беларускай прымаўкай „мая хата з краю, я нічога не знаю" клапаціцца толькі пра сябе? Без ідэй 25 сакавіка 1918 г. пра самавызначэнне беларускага народа, без імкнення быць гаспадаром на сваёй зямлі, таксама і ў духоўна-культурнай прасторы, нашы прадзеды, дзяды, бацькі не змаглі б і нам, іхнім нашчадкам, перадаць найпрасцейшыя запаветныя словы, але на беларускай мове ці яе гаворцы.

Землі, на якіх пражывае беларускі народ, былі сведкам жудасных падзей I і II сусветных войнаў. Тут крывавае жніво збіралі таталітарныя ідэі камунізму і фашызму. Увесь гэты гістарычны багаж пакінуў свой адбітак на нашых ідэях, дзеяннях, штодзённым жыцці. Заангажаванасць у беларускія справы наводзіла клопаты і небяспеку не толькі асабіста, але і ў грамадскай прасторы. Беларускаму народу чужынцы здолелі накінуць страх, які і па сённяшні дзень вызначае некаторыя нашы рэакцыі і паводзіны. Ларыса Геніюш у вершы „Страх" заклінае:

Страх гуманнасці, дабраты,
Перад рускім страх, перад ляхам...
Ці ж мы горшыя, га, Браты?
Можа хопіць гэтага страху!

Ларыса Геніюш кінула выклік страху. Нягледзячы на выпрабаванне ў савецкіх лагерах, не зважаючы на пераслед на сваёй роднай Гродзеншчыне, яна як верная ідэям не-

[працяг ☞ 2]

85-я ўгодкі БНР у Празе ☞ 2

З мінулага года ў Празе стаў жыць і самы выдатны беларускі выхадзец, пісьменнік Васіль Быкаў. Ён ужо колькі гадоў туляецца па Еўропе — раней прабываў у Фінляндыі і Нямеччыне — не могучы жыць у гнятлівай атмасферы неабальшавіцкага, беларусафобнага рэжыму ў Мінску. Быкаў пра сябе кажа, што ён не пакінуў Беларусі назаўсёды і не лічыць сябе эмігрантам...

Ліквідацыю пакуль стрымалі ☞ 3

Да канца красавіка не будуць адтэрмінаваны ніякія рэгіянальныя цягнікі ў Падляшскім ваяводстве. Нявыключана таксама, што да 13 снежня 2003 года, значыць, да дня змены раскладу язды цягнікоў, не ўсе з планаваных пакуль што 20 цягнікоў не будуць ліквідаваны.

Беларусь і Украіна ☞ 4

Нядобрым знакам з'яўляецца той факт, што пра важныя справы двух народаў не маглі сустрэцца і пагаварыць людзі навукі. Найчасцей гэта інтэлектуальныя эліты пачыналі дыялог. Відаць, разуменне значэння Беларусі ва Украіне і Украіны ў Беларусі амаль нулявое.

Лукашэнка пашкадаваў мастакоў ☞ 8

Пасля ўступлення ў дзеянне Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 495 „Аб удасканаленні парадку вызначэння памераў арэнды" жыллёва-эксплуатацыйныя службы (так званыя ЖЭСы) разаслалі беларускім мастакам адмысловыя лісты, у якіх у пагрозлівай форме прапанавалі творцам тэрмінова перазаключыць дамовы на арэнду майстэрняў на новых умовах...

Пілігрым Тамаш Зан ☞ 9

Паэт-рамантык пахаваны на старых могілках у Смалянах. Яго магіла ўжо ў XIX стагоддзі была месцам культу, сустрэнем яе на карцінах Напалеона Орды. Сюды цягнулі паломнікі з усіх куткоў Літвы і Кароны — літаратары, паўстанцы, пазітывісты, закаханыя...

Масленіца ☞ 10

Масленіцу святкавалася ў апошні тыдзень перад Вялікім пастом. Гэта першае веснавое свята, якое завяршае зіму і ўслаўляе прыход вясны, сонца і цяпла. Масленіца святкавалася на працягу тыдня і называлася „шырокай". Яна была цесна звязана з праваслаўнай абраднасцю — праз гэты тыдзень елі малочныя прадукты, бліны, аладкі.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

85-я ўгодкі БНР у Празе

Сёлета ў Празе адзначаць угодкі Беларускай Народнай Рэспублікі сабралося пад 200 чалавек — найбольшая такая грамада беларусаў, што мне ўдалося пабачыць у чэшскай сталіцы за апошнія пяць гадоў. Тры чвэрці людзей былі мне зусім незнаёмыя. Гэта было самае яскравае пацвярджэнне майго здогаду, што колькасць палітычных уцекачоў і эканамічных выхадцаў з Беларусі ў Чэхію ўсё працягвае расці.

Дарэчы, з мінулага года ў Празе стаў жыць і самы выдатны беларускі выхадзец, пісьменнік Васіль Быкаў. Ён ужо колькі гадоў туляецца па Еўропе — раней праблываў у Фінляндыі і Нямеччыне — не могучы жыць у гнятлівай атмасферы неабальшавіцкага, беларусафобнага рэжыму ў Мінску. Быкаў пра сябе кажа, што ён не пакінуў Беларусі назаўсёды і не лічыць сябе эмігрантам, аднак жа не наважваецца прадказваць, калі (дый ці ўвогуле) зможа вярнуцца на бацькаўшчыну.

Сход прысвечаны ўгодкам БНР меў месца ў суботу (23 сакавіка), традыцыйна ў гэтак званай Люстраной капліцы старажытнага комплексу Чэшскай нацыянальнай бібліятэкі (Клементынум). Сяргей Навумчык, супрацоўнік Беларускай службы Радыё Свабода ў Празе і намеснік старшыні Рады БНР, прыгадаў прысутным, што ў гэтай самай зале, 80 гадоў таму, тагачасныя беларускія выхадцы ў Празе адзначалі 5-я ўгодкі БНР. Гэтая канстатацыя даволі добра перадае асаблівы характар беларускага нацыянальнага свята: як і даўней, свабодна адзначаць яго можна толькі за межамі Беларусі, а сам ідэал БНР — вольная і незалежная беларуская дзяржава — усё застаецца няздзейснены і не вельмі каб бліжэйшы, чым у 20-я гады мінулага стагоддзя.

З другога боку, абвяшчэнне БНР сталася бадай ці не адзінай падзеяй беларускай гісторыі, ушанаванне якой мае, нават улічваючы абмежаванні палітычнага характару, больш-менш агульнабеларускі (прытым — не накінуты ўладай) характар. Ніякая іншая дата беларускай гісторыі не мае такой прыцягальнай сілы. Васіль Быкаў сказаў у Празе, што 85 гадоў таму Актам 25 Сакавіка 1918 г. беларусы запалілі агеньчык надзеі, які гарыць да сённяшняга дня. Інакш кажучы, свята 25 Сакавіка — гэта свята беларускай надзеі. А надзея, як кажуць згасае апошняй.

Перад сабранымі ў Празе таксама выступіла старшыня Рады БНР Івонка Сурвіла, якая прыехала дзеля гэтага з Канады. Спадарыня Сурвіла акцэнтавала ў сваёй прамове патрэбу агульнабеларускай еднасці ў змаганні з рэжымам. Пра нядаўні сход беларускай інтэлігенцыі ў Мінску згадаў у сваім слове пісьменнік Валянцін Тарас, віцэ-прэзідэнт Беларускага ПЭН-цэнтра (прэзідэнтам з'яўляецца Васіль Быкаў). Выступіла і старшыня суполкі беларусаў імя Францішка Скарыны ў Празе Ганна Сурмач, якая, між іншым, павіншавала з 75-годдзем Юрку Станкевіча, арганізатара беларускага нацыянальнага жыцця ў Чэхіі і выдаўца англамоўнага квартальніка „Belarusian Review". Спадара Юрку Станкевіча можна залічыць да „старых пражанінаў" — ён жыў у Празе, з перапынкамі, перад Другой сусветнай вайной і ў часе вайны ды пасяліўся тут пасля таго, як перайшоў на пенсію. Віншаванні гучалі таксама для дзвюх параў з найноўшай хвалі беларускага выхадства, у якіх нарадзіліся дзеці. Маладая беларуская эміграцыя ў Чэхіі спакваля пачынае ўладкоўвацца салідней і пускаць карані ў гэтай краіне.

Сход закрыўся песнямі, выкананымі пад гітару двума беларускімі бардамі: Андрэем Мельнікавым з Мінска і Сяржуком Сокалавым-Воюшам (раней з Полацка, а цяпер пражанінам). Традыцыйна, адзначэнне ўгодкаў БНР у Празе закончылася наведаннем магіл экзільных прэзідэнтаў БНР — Пятра Крэчэўскага і Васіля Захаркі — ды выдатнага беларускага спевака Міхала Забэйды-Суміцкага на Альшанскіх могілках. Пазней быў супольны абед у адным з пражскіх рэстаранаў.

Ян Максімюк

(Прага, „Радыё Свабодная Еўропа/ Радыё Свабода")

Георгій Таразевіч (1937-2003)

21 сакавіка 2003 г. у Мінску памёр Георгій Таразевіч — вядомы беларускі палітык, дзяржаўны і грамадскі дзеяч.

Георгій Станіслававіч нарадзіўся 17 ліпеня 1937 г. у сяле Слабада Мядзельскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Львоўскі політэхнічны інстытут (1959) і Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Працаваў начальнікам Беларускага картаграфічнага геадэзічнага прадпрыемства (1969), старшынёю Мінскага гарвыканкама (1980), першым сакратаром Мінскага гаркама КПБ (1983), старшынёю Камітэта па геадэзіі пры Савеце Міністраў РБ (1991), першым намеснікам міністра замежных спраў РБ (1993) і паслом у Польшчы (1994-1995). Быў старшынёю Вярхоўнага Савета БССР і намеснікам старшыні Вярхоўнага Савета СССР.

Будучы дэпутатам ВС выказаўся за гістарычную сімволіку. Станіслаў Шушкевіч успамінае, што яго выступленне на беларускай мове з прапановай прыняць бел-чырвона-белы сцяг і герб Пагоня станоўча паўплывала на партнаменклатуру, дзякуючы чаму магчымым стала прыняцце закона аб гістарычнай сімволіцы.

Георгій Таразевіч адмоўна паставіўся да рэферэндуму 1995 года. Тады выступіў у абарону нацыянальнай сімволікі і беларускай мовы, а ў знак пратэсту адмовіўся ад пасады пасла ў Варшаве і перайшоў у апазіцыю. З таго часу быў сябрам ЦК Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі „Народная грамада". Апазіцыйная дзейнасць паўплывала на тое, што дзяржаўныя ўлады адмовіліся ад сарганізавання пахавання гэтага заслужанага для Беларусі чалавека. Развітацца з нябожчыкам у Дом літаратара прыйшлі сябры па дэмакратычным руху і былыя высокія чыноўнікі. Цяперашнія ўлады прадстаўлялі толькі прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Міхаіл Мясніковіч і старшыня Канстытуцыйнага суда Рыгор Васілевіч.

Георгія Таразевіча пахавалі на Усходніх могілках у Мінску.

(вл)

Памёр Сяргей Абадоўскі

23 сакавіка на 53 годзе жыцця памёр вядомы беларускі праваабаронца Сяргей Абадоўскі.

Многія ведалі яго не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Ягоная адданая абароне правоў чалавека дзейнасць прынесла яму вядомасць, у прыватнасці, у Расіі, Амерыцы і Польшчы, дзе ён шчыльна супрацоўнічаў з Польскім фондам правоў чалавека.

У беларускі дэмакратычны рух Сяргей Абадоўскі прыйшоў праз незалежную прафсаюзную дзейнасць. На працягу доўгіх гадоў узначальваў Магілёўскую абласную рэгіянальную арганізацыю Свабоднага прафсаюза. Знаходзячыся на пасадзе старшыні, прыдбаў вялікі вопыт абароны правоў працоўнага люду ад несправядлівасці з боку адміністрацый прадпрыемстваў і прадстаўнікоў уладных структур. Узбагачаючы свае прававыя веды ён становіцца адным з пачынальнікаў праваабарончага руху на Магілёўшчыне і ва ўсёй Беларусі. Аб гэтым сведчыла ягоная праца ў Магілёўскім аддзяленні Беларускага Хельсінскага камітэта, які сёння з'яўляецца найбольш уплывовай праваабарончай арганізацыяй у краіне.

Набытыя веды і практычны досвед правазнаўства дазваляюць яму, у мінулым звычайнаму рабочаму, паступіць і выдатна закончыць Інстытут правазнаўства, стаць сябрам Амерыканскай асацыяцыі юрыстаў, стварыць і ўзначаліць адзіную ў Беларусі самастойную рэгіянальную праваабарончую арганізацыю — Магілёўскі праваабарончы цэнтр.

Цяжка перанесці заўчасную страту гэтага чалавека не толькі родным, блізкім, а таксама тым сотням беларускіх грамадзян, якія заўсёды знаходзілі ў ім добрага дарадчыка і прынцыповага абаронцу іх законных інтарэсаў.

Зямны час Сяргея Абадоўскага скончыўся, але засталіся пакінутыя ім добрыя справы, якія мусяць працягнуць ягоныя паплечнікі.

Уладзімір Лапцэвіч

Дзень надзеі

[1 ☞ працяг]

залежнай Бацькаўшчыны, адмовілася прыняць грамадзянства Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Па сённяшні дзень яна не рэабілітаваная ўладамі. Для выдатнай паэтэсы і беларускага змагара адначасна не можна ўзнесці хаця б маленькага помніка, калі ў гарадах і вёсках Беларусі прыходзіцца глядзець на помнікі тых, хто знішчаў і разбураў найлепшыя праявы беларускай незалежнай ідэі.

Але дзякуючы такім людзям як Ларыса Геніюш, не знікае і жыве наша вера ў беларускую перамогу, разуменне і адказнасць за словы Бацькаўшчына, Малая Айчына, беларускі выбар. У 2003 годзе Беларускае літаратурнае аб'яднанне „Белавежа" адзначае юбілей 45-годдзя дзейнасці. Для часткі „белавежцаў" сустрэчы з Ларысай Геніюш і яе паэзіяй былі тым імпульсам, што дазволіў паверыць у свой беларускі лёс. Тут, на Беласточчыне, спачыў на векі сын Ларысы Геніюш — Юрка, якога літаратурны талент прывёў у Літаратурнае аб'яднанне „Белавежа". Прыроджаная інтэлігентнасць дазваляла яму пранізліва бачыць беларусаў Беласточчыны — як аграмадны патэнцыял, які можам, на жаль, самі растраціць. У мініяцюры „Смыком па сэрцы", прысвечанай выпускнікам Бельскага беларускага ліцэя раскрывае праўду аб нас учарашніх і сённяшніх. „І злосць бярэ, кумячыш ліст паперы і шчыміць нешта болем пад грудзьмі, і марыш вось, каб двойку хто паставіў за мову родную, сярод сваіх, у сям'і. А вас ужо грамада. Шарэнгі і плутоны ў свет пайшлі, каб долю зваяваць. Сярод бландзінаў, рыжых і чарнявых, ніводнага, здаецца, і не пазнаць... І цяжка мне. Хацелася б быць з вамі. З штодзённай мусі пляснуцца ў той струмень той плыні беларускай, у ліцэі ўзгадаванай. Гаворкай роднаю — датліць тугу..."

Словы Юркі Геніюша, то словы пытанні аб нашай тут адказнасці за беларускае. За беларускае штодзённае, а не толькі „рэзерватна-святочнае".

Дзень Волі 25 Сакавіка — свята вольных людзей. Дзе воля перамагае страх і дзе зіма саступае месца вясне. Хаця ж зіма сваёй халоднай помстай няраз памарозіць буйна расцвілыя сады і кветкі. Але сённяшняе сакавіцкае свята 85-й гадавіны Беларускай Народнай Рэспублікі ставіць перад намі, тут прысутнымі, шматлікія пытанні: вакол якіх ідэй і спраў трэба нам самаарганізавацца сёння і заўтра? Ці зможам мы захаваць нашу беларускую тоеснасць у Польшчы?

Досвед, які мы набылі пасля перамен 1989 г. паказвае, што толькі пабудова нашых дзеянняў і намаганняў вакол ідэі беларускай самастойнасці можа даць станоўчыя вынікі. Толькі тады, калі мы выразна пазначаем, што мы — беларусы і ставім нашы праблемы, тады хаця пачынаюць нас слухаць. Інакш становімся і станемся атамізаванай падзеленай часткай польскага грамадства, а не беларускай нацыянальнай меншасцю, якая хоча сваім голасам вызначаць і вырашаць справы сваёй будучыні. Але не толькі вонкавыя абставіны з'яўляюцца фактарам нашай сённяшняй сітуацыі. Рэчаіснасць у некаторых сферах магла б выглядаць нашмат лепей, але падыход нас самых да праблем беларускай адукацыі, самакіравання, культуры не дазваляе на чаканую ўсімі паспяховасць. Калі ж на перашкодзе да рэалізацыі агульнабеларускіх ідэй стаяць самі беларусы, дык пытаюся, ці не час урэшце выразна сказаць ім досыць, так рабіць нельга, а не хаваць галаву ў пясок за страусамі, якіх шмат зараз разводзяць на Беласточчыне.

Дзень Волі — дзень надзеі на лепшую будучыню, у якой беларускасць зойме сваё, належнае месца, як у беларускай дзяржаве, так і ў нас, у Польшчы. Наша сённяшняя прысутнасць — пацвярджэнне, што Акт 25 Сакавіка 1918 г. для ўсіх нас не пустыя словы. Кожны з нас уносіць сваю цагліну ў пабудову духоўнай прасторы беларускага народа. Межы можна адкрыць і закрыць, але раз паднятага духоўнага нацыянальнага адраджэння не разбурыць нат і стагоддзямі.

Гэты вольны беларускі дух дазваляе нам, беларусам у Польшчы, самаарганізавацца з большымі ці меншымі поспехамі ў грамадска-палітычнае ці культурнае жыццё. Няхай здзейсняцца сны беларускага народа пра незалежную, дэмакратычную і багатую Беларусь, якою будуць ганарыцца таксама беларусы, Польшчы.

Жыве Беларусь!

Яўген Вапа, старшыня
Беларускага Саюза ў РП

(з выступлення на ўрачыстасці ў Беластоку)

Што чакае сялян у Еўрасаюзе?

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

[1 ☞ працяг]

— Ці будуць даплаты, калі зарасце аблагом луг або параніна?

— Тады даплатаў не будзе. Трэба прынамсі раз у год касіць траву, а параніна павінна быць чорнай.

— У якіх выпадках даплаты могуць быць большымі?

— Калі землі ў гміне будуць лічыцца цяжкай прасторай, даплаты да гектара зямлі будуць большымі на 120-200 зл. На такое вырашэнне могуць разлічваць гміны, дзе многа зямлі дрэннай якасці. Гаспадары могуць апрацоўваць бізнеспланы і звяртацца за дапамогай па 5 тыс. зл. у год. Калі пасля 3 гадоў праверым, што грошы выдаткоўваюцца правільна, тады можна будзе звяртацца за падобнай дапамогай на чарговыя некалькі гадоў. Будуць таксама даплаты да экалагічнага гаспадарання па 500 зл. да гектара зямлі ў год. Тыя асобы, якія будуць дастасоўваць свае гаспадаркі да еўрапейскіх стандартаў, могуць на працягу 5 гадоў атрымліваць па 800 зл. успамогі да кожнага гектара зямлі.

— Што павінен зрабіць гаспадар, каб атрымаць гэтыя даплаты?

— Гаспадары павінны да 15 мая 2004 года падаць у нашае бюро прашэнні з вопісам сваіх палёў. У дакументах павінны быць нумары зямельных участкаў, іх велічыня і апісанне вырошчваных культур. Тыя, якія будуць звяртацца за дапамогай, павінны быць уласнікамі або арандатарамі зямлі. Мы будзем правяраць мінімум 5% палёў і рэгістрацыю хатняй жывёлы. Даплат не будзе, калі выявім няправільнасці.

— Як будзе з тымі, якія пасадзілі лес або хочуць яго садзіць?

— Тыя, якія пасадзілі лес не атрымаюць дадатковай дапамогі. Калі гаспадары рашацца аблясяць паводле дазволу, выдадзенага ў старастве або нашым бюро, то павінны атрымаць ад 3 400 зл. да 6 200 зл. на гектар аблясення, з выкарыстаннем іх на саджанцы, агароджу і іншыя выдаткі. Праз 5 гадоў будуць атрымліваць па 400-520 зл. за дагляданне лесу і на працягу 20 гадоў атрымаюць прэмію размерам 600 зл. у год. Каб атрымаць гэтыя даплаты трэба аблясяць землі V і VI класаў. Аднак мая просьба да нашых гаспадароў, каб не аблясялі зямлі, на якой працавалі нашыя дзяды і прадзеды. Можа быць яшчэ так, што яна стане патрэбнай.

— Якія могуць узнікнуць складанасці?

— Баюся, што гаспадары могуць заблытацца ў дакументах. Запрашаю ўсіх у нашае бюро і мы дакладней растлумачым невядомае ў справе даплат. Жыхарам вёсак павінны памагчы працаўнікі сельскагаспадарчых дарадчых асяродкаў, радныя, солтысы і гміннныя чыноўнікі.

— Ці не апасаецеся, што пасля ўступлення Польшчы ў Еўрасаюз могуць патаннець многія сельскагаспадарчыя прадукты. Сялянам без дадатковых фінансавых сродкаў цяжка будзе канкурыраваць з заходнімі фермерамі.

— Гэта будзе залежаць ад нашых палітыкаў, ад таго як яны будуць кіраваць нашай краінай.

— Чыноўнікам цяжка будзе спыняць перавоз сельскагаспадарчых прадуктаў у рамках Еўрасаюза.

— На прывоз сельскагаспадарчых прадуктаў маюць уплыў службы аховы расліннасці і ветэрынарныя службы. Аднак мы павінны скарыстаць на тым, што нашае экалагічнае харчаванне здаравейшае і смачнейшае. Жыхары вёсак павінны купляць польскія сродкі сельскагаспадарчай прадукцыі, а жыхары гарадоў нашае харчаванне. Мы павінны ўзаемна дапамагаць сабе. Трэба інфармаваць пра нашыя здаровыя прадукты з краіны зубра.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

Угодкі ў Гайнаўцы

[1 ☞ працяг]

рэпертуару, а сярод іх — „Малітву" і „Авэ Марыя". У час спявання песні „Магутны Божа" ўсе вучні і настаўнікі стаялі на зважай. У Гайнаўскім белліцэі ўспрымаюць яе, як беларускі гімн.

— Вучні, якія прыходзяць у нашую гімназію часта ўпершыню чуюць пра святкаванне ўгодкаў абвяшчэння незалежнасці Беларусі. З кожным годам даведваюцца штораз больш пра гэтае святкаванне і зараз лічаць яго веснавым беларускім святам, — заяўляе настаўніца беларускай мовы Іаланта Грыгарук, якая апекавалася вучнямі I „а" класа, што рыхтавалі ўрачыстасць для ліцэістаў.

— Дзень 25 сакавіка вельмі важны для нас — вучняў Беларускага ліцэя. Нам трэба цікавіцца беларускімі справамі, — кажа Іаанна Трафімюк.

— Гэта важны дзень, які святкуюць сапраўдныя беларусы, — дадае яе сяброўка Альжбета Ляшкевіч.

Вучням спадабалася выкананне лірычных песень. Сярод патрыятычных вершаў, якія дэкламаваліся перад белгімназістамі і белліцэістамі, некаторыя паўтараліся. Найчасцей гучалі творы Янкі Купалы, Наталлі Арсенневай, Максіма Багдановіча, Ларысы Геніюш, Сержука Сокалава-Воюша, Алеся Барскага, Віктара Шведа і Алеся Гаруна. Вялікае ўражанне на вучнях выклікалі размешчаныя на калідорах гербы „Пагоня" і гістарычныя звесткі. Белліцэісты на плакатах звярнулі ўвагу, што незалежнасць Беларусі абвешчана была на 8 месяцаў раней чым незалежнасць Польшчы.

— Усе вучні ведаюць што абазначае дата 25 сакавіка, бо штогод у гэты дзень арганізуюцца лінейкі і школа абклеена нацыянальнай сімволікай, — заяўляе Наталля Зофія Лемеш, якая з Кацярынай Іванюк ад Клуба беларускіх спраў „Граблі" падрыхтавалі і павесілі ў школе ўсе гербы і гістарычныя інфармацыі. — Мы радуемся таму, што радуюцца беларусы за мяжой, гэта нашая падтрымка беларускаму патрыятызму.

Аляксей Мароз

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Віцэ-маршалак Ян Камінскі і Гжэгаж Уклееўскі: Чакаем рашэння камісіі Марка Поля

Ліквідацыю пакуль стрымалі

Да канца красавіка не будуць адтэрмінаваны ніякія рэгіянальныя цягнікі ў Падляшскім ваяводстве. Нявыключана таксама, што да 13 снежня 2003 года, значыць, да дня змены раскладу язды цягнікоў, не ўсе з планаваных пакуль што 20 цягнікоў не будуць ліквідаваны.

У Падляшскай маршалкоўскай управе адбылася сустрэча прадстаўнікоў ПМУ, улад гмін і паветаў (м.інш. Чаромхі, Нараўкі і Гайнаўкі), прафсаюзаў і парламентарыяў з намеснікам старшыні кіраўніцтва Падляшскага прадпрыемства рэгіянальных перавозаў Гжэгажам Уклееўскім. Размовы працягваліся некалькі гадзін. Што будзе з планаванай ліквідацыяй пакуль што ў сапраўднасці невядома. Ліквідацыйныя планы ПКП да канца красавіка будзе правяраць спецыяльная камісія, якую стварылі ў Варшаве з даручэння віцэ-прэм'ера і міністра інфраструктуры Марка Поля. Вядома ўжо, што на шляху Гайнаўка — Цісоўка хадзіць будзе рэйкавы аўтобус (пакуль што ён толькі ў фазе прадукцыі). Ужо напэўна, як заявілі падляшскі віцэ-маршалак Ян Камінскі і войт Чаромхі Міхал Врублеўскі, да 13 снежня будуць курсіраваць таксама тры з пяці параў цягнікоў Чаромха — Бельск-Падляшскі і Бельск-Падляшскі — Беласток.

— Я цешуся, што не дойдзе да цалкавітага спынення руху цягнікоў на гэтым шляху, што моладзь будзе давозіцца ў школы, — гаварыў у перапынку сустрэчы чаромхаўскі войт.

Прытым дадаў:

— У гмінах няма грошай на ўтрыманне маршрутаў.

У ваяводскага самаўраду таксама іх няма.

— Грошы — з бюджэту дзяржавы. Уласных сродкаў ваяводскі самаўрад не мае, — прызнаўся ў размове з „Нівай" дэпутат Яўген Чыквін.

У раскладзе, які абавязвае да 13 снежня, ёсць 109 рэгіянальных цягнікоў. На думку Польскае дзяржаўнае чыгункі, толькі дзевяць з іх — рэнтабельныя. Рэшта прыносіць дэфіцыт у больш за 27,5 млн. зл. (паводле іншых даных — каля 31 млн. зл.).

— Мяркуем у апошні час адтэрмінаваць дваццаць найбольш дэфіцытных спалучэнняў на Падляшшы. Няма цяпер рэнтабельных цягнікоў, — пераконваў віцэ-прэзас Гжэгаж Уклееўскі.

На яго думку, у нашым рэгіёне мадэльны прыклад „рэнтабельнага" цягніка гэта той, што ходзіць на шляху Гайнаўка — Варшава. Але і так рэнтабельны ён толькі ў 88 працэнтах.

— Думаючы аб адтэрміноўцы, бралі мы пад увагу тыя цягнікі, якія вяртаюць кошты ў менш чым 30 працэнтах, — запэўніваў Уклееўскі. — Страты пагашае казна.

Невядомая сітуацыя на стратэгічным, прыгранічным шляху Беласток — Кузніца-Беластоцкая (і ў другі бок) ды Саколка — Кузніца-Беластоцкая. Ні адзін з іх не з'яўляецца рэнтабельным, але хоць па адным яны датаваны. Віцэ-прэзас Уклееўскі прабаваў тут спасылацца на двухбаковыя дамовы (у гэтым выпадку — польска-беларускія), аб пасажырскім чыгуначным руху.

— Беларускі бок не выступіў з прапановай адтэрмінаваць гэтыя пераезды.

Зараз, аднак, дадаў:

— Цягнікі будуць хадзіць, калі будуць рэнтабельнымі.

Сустрэчу ў Падляшскай маршалкоўскай установе абагульніў віцэ-маршалак Камінскі:

— Сітуацыя на сёння — у меру здавальняючая. У найбліжэйшы час не прадбачваецца большай колькасці ліквідацыі перавозаў, асабліва тых, якія досыць рэнтоўныя, хоць не прыносяць прыбытку.

Тым часам, значыць, застаецца чакаць 30 красавіка і рашэнняў камісіі віцэ-прэм'ера Марка Поля.

(холм)

Ёсць праблема

Каля чыгуначнай станцыі ў Чаромсе знаходзіцца пляцоўка для мытнага кантролю аўтафураў. Пабудавала яе гміна і перадала ў карыстанне мытнай установе. Пляцоўка аднаразова можа памясціць не больш васьмі машын. У пачатковым перыядзе дзейнасці мытнай службы, месца аўтафурам хапала. Зараз з'явілася праблема. Пляцоўка стала зацеснай. Многія аўтафуры затрымоўваюцца проста на вуліцы, па абодвух баках, а ў выніку цяжка праехаць легкавым аўтамабілем. Варта адзначыць, што насупраць пляцоўкі знаходзіцца аптэка „Арніка", да якой прыязджаюць пацыенты за лякарствам. Бяда ў тым, што шафёрам няма дзе спыніць аўтамабіль, бо аўтафуры блакіруюць вуліцу. Такая сітуацыя спрыяе дарожным выпадкам. Хопіць заглядзецца на момант і аварыя гатова.

Войт лічыць, што гэтая справа ў кампетэнцыі мытнай службы. „Для іх разбудоўваць пляцоўку не буду, — кажа. — Гэта яны бяруць грошы". Святая праўда. Хто бярэ грошы, хай дбае. Таму мытнікі павінны задбаць пра парадак. Бо, калі здарыцца аварыя і пацерпяць людзі, будзе ўжо запозна.

Уладзімір Сідарук

Вачыма паляка

Кавалак торта для „Рацыі”

Калі штосьці нагадвае каня, дык гэта конь, — такую залатую думку выказаў некалькі дзён таму Раман Гертых, сеймавы лідэр Лігі польскіх сем’яў (LPR) у тэлевізійнай размове з зоркай польскай журналістыкі Монікай Алейнік. Не буду ўспамінаць пра кантэкст, у якім выказаў сваю думку дэпутат, але, пранікаючы ў яго глыбіню, цяжка ўлавіць логіку. Іншая справа, калі б дэпутат Гертых сказаў: „Які конь ёсць, кожны бачыць”, хоць і тут можна было б спрачацца адносна праўдзівасці гэтага тэзіса, бо, як вядома з іншае прыказкі, „кожны бачыць тое, што хоча”. Спасылаюся аднак на „конскае” сцвярджэнне Рамана Гертыха *a propos* дыскусіі аб навелізацыі закону аб радыёвяшчанні і тэлебачанні, трэцяй па важнасці падзеяй польскіх СМІ, пасля вайны з Іракам і, калі злічыць, пасля афёры Рывіна і допытаў следчай камісіі, з якімі справа навелізацыі, дарэчы, сцісла павязана. Магу сцвярджаць, што працэс змен у гэтым законе і выказванні на тэму яго падрыхтоўкі дакладна выяўляюць лагічную супярэчлівасць сцвярджэння „калі штосьці нагадвае каня, дык гэта конь”.

* * *

Тыя, што хадайнічаюць за змену супярэчлівага закону, пры нагодзе менш ці больш пазітыўныя героі *Рывінгейт*, падкрэсліваюць неабходнасць яе дастасавання да медыяльнага права Еўрасаюза. Ставяць на гэта націск апрацоўваючая змены з урадавага боку Аляксандра Якубоўская, сакратар Краёвай рады тэлебачання і радыёвяшчання (KRRiT) Владзімеж Чажасты, падляшская дэпутатка з сеймавай камісіі культуры Барбара Цірук і сам прэм’ер Лешак Мілер. На хвалі навелізацыі праціўнікі спасылаюцца на рапарт дэпутаваных Еўрапейскага парламента і Сусветнай рады медыяў, якія абвінавачваюць польскае заканадаўства, а затым і ўрад, у абмяжоўванні свабоды слова, прычым ставяць яны Польшчу нараўні, для прыкладу, Беларусі. У гэтай групе, галоўным чынам, прыватныя вяшчальнікі (м.інш. шэф „Выбарчай газеты” і яе выдаўца — суполка „Агора”).

Не хачу пранікаць у тое, хто ў гэтай дыскусіі мае рацыю, хто і што хацеў і хоча выйграць. Ад гэтага ёсць урад, парламент і вылучаная з яго сеймавая следчая камісія. Аднак, больш цікавыя ў гэтай справе — пабочныя матывы і сцвярджэнні, якія некаторымі кідаюцца быццам мімаходам. Вось, у дэбаце ў беластоцкім тэлебачанні „Падляшскі дэпутацкі форум” (18 сакавіка), прысвечанай навелізацыі закона, шматразовы герой „Вачэй”, дэпутат ад LPR Анджэй Фэдаровіч заявіў у гэтым кантэксце:

— Медыі прэтэндуюць да першай улады. Прэзідэнта і войта выбіраюць сёння медыі.

— Або выбаршчыкі таго, хто сёння мае штосьці сказаць, — нясмела перабіла яму дэпутатка Цірук.

Голас дэпутаткі, аднак, заглух у гэты момант у вывадах дэпутата Фэдаровіча:

— Гэтая барацьба, якая датычыць медыяў — барацьба ўнутры сацыялістычнага лагера.

Дэпутатка Цірук (СЛД) гэтае сцвярджэнне падагуліла толькі іранічнай усмешкай. Падобна, дарэчы, рэагавалі апошнія падляшскія дэпутаты, якія, на маю думку, у большасці не мелі што сказаць па зададзенай TVP тэме, значыць, ані Юзаф Мядушэўскі (ПСЛ), ані Генавефа Вісьнёўская („Самаабарона”, дарэчы, шэфіха сеймавай камісіі нацыянальных меншасцей), Марэк Загурскі (Кансерватыўна-нацыянальная партыя), не ўспамінаючы ўжо пра Анджэя Фэдаровіча. Каля Барбары Цірук, можа, толькі ломжынскі дэпутат ад Права і справядлівасці Міхал Камінскі з прычыны свайго журналісцкага дасведчання, прабаваў раскусіць сутнасць справы, спасылаючыся, дарэчы, на ўспомнены рапарт аб свабодзе слова ў Польшчы.

* * *

У дыскусіі беластоцкага тэлебачання, як і ранейшай, сеймавай, галоўная вось спрэчак верціцца наўкол антыканцэнтрацыйнага запісу, значыць, такога, які абмяжоўваў бы развіццё прыватных медыяў, а які быццам меў затармазіць экспансію на рынку медыяў, перш за ўсё электронных (тэлебачанне, радыё) „Агоры” і наўкол яго — удзелу ў ім чужаземнага капіталу. Нікога, аднак, не абходзіць і ніхто не ўспамінае аб магчымасці функцыянавання, пасля ўвядзення ў жыццё навелізацыі — радыёстанцый нацыянальных меншасцей, хоць бы, будучае ў стане клінічнай смерці, Радыё „Рацыя”. Была гэта радыёстанцыя фінансаваная з прыватных сродкаў, дакладней — няўрадавых, таксама і неабаненцкіх. Ані згодна з законам аб радыёвяшчанні і тэлебачанні ад 29 снежня 1992 г., ані актуальна планаванай навелізацыяй, няма магчымасці, каб беларуская, і яшчэ якая „меншасныя” радыёстанцыі ў Польшчы маглі, пасля адыходу іхных спонсараў, мець магчымасць доступу да падзелу рэкламнага торта. Нікому з законастваральнікаў не прыйшло ў галаву, каб акрэсліць (што я прапаную) працэнтна пабольшаны той удзел у адносінах да іншых прыватных вяшчальнікаў, нічым неабмежаваны ў канкурэнцыі з публічнымі медыямі. Так, каб даць рэальны шанц „брання пад увагу патрэб нацыянальных меншасцей і этнічных груп”, як сцвярджаецца ў законе ад 1992 г. у адносінах да публічных радыёвяшчання і тэлебачання.

* * *

Але пра што я ўвогуле ўспамінаю? Аб нейкай абстракцыі! „Найперш прыбярыце пасля гранаты, якая трапіла ў нужнік, а пасля гаварыце, што ўстанаўліваеце закон!” — сказала ў час сеймавай дэбаты аб навелізацыі закона аб радыёвяшчанні і тэлебачанні дэпутатка ад Грамадзянскай платформы Івона Следзінска-Катарасінска. І гледзячы на справу навелізацыі ў кантэксце афёры Рывіна, пэўна, праўда за ёю. У пытанні функцыянавання Радыё „Рацыя” не мае тут гэта месца, ані нікога гэта не цікавіць. Да дыскусіі ў TVB не быў запрошаны дэпутат ад праваслаўнага асяроддзя — Яўген Чыквін (член сеймавай камісіі культуры). Ён — член клуба СЛД, а ў праграме мела быць толькі па адным прадстаўніку клуба, і СЛД прадстаўляла Б. Цірук, таксама з камісіі культуры. Была шэфіха камісіі нацыянальных меншасцей Генавефа Вісьнёўская. Проста — была. Два дні пасля рушыла яна на пагранпераход у Баброўніках, каб з іншымі членамі „Самаабароны” дамагацца сапраўдных інфармацый аб уваходзе Польшчы ў ЕС і супрацівіцца вайне ў Іраку. Урэшце ж, напад на Ірак гэта найважнейшы ньюс, больш важны ад навелізацыі закону аб радыёвяшчанні і тэлебачанні, не ўспамінаючы ўжо пра дзейнасць нейкага там беларускага радыё „Рацыя”. Пакуль што, застаецца, чакаючы развіцця падзей, узброіцца ў сілу спакою, найлепш перажоўваючы салодкую жвачку, як міністр Якубоўская ва ўрадавай ложы ў час сеймавай дэбаты аб навелізацыі закона.

Мацей Халадоўскі

Беларусь — Украіна: краіны раздзеленыя высокім муром

Па ініцыятыве Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі ў днях 18-19 сакавіка была арганізавана ў Мінску навуковая канферэнцыя, якая мела ацаніць тысячу гадоў узаемадачыненняў Беларусі і Украіны. Змест запрашэння паказвае, што канферэнцыю арганізавалі таксама Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Украіны і пасольства Украіны ў Беларусі.

Геаграфічная і палітычная сітуацыя абедзвюх краін падказвае, што яны сабе надта патрэбныя. Можна толькі ўявіць як выглядала б існаванне незалежнай Украіны, калі б у месцы Беларусі з’явіліся, напрыклад, Магілёўская, Брэсцкая ці Гомельская губерні Расійскай Федэрацыі. Існаванне ўкраінскай незалежнай дзяржаўнасці несумненна таксама стрымоўвае вялікіх энтузіястаў інтэграцыі з усходняй суседкай. Хаця нічога не паказвае, што арганізатары канферэнцыі разважалі ў такіх палітычных катэгорыях, аднак, можа несвядома, зрабілі крок у адпаведным напрамку.

Ніхто не павінен сумнявацца, што канферэнцыя, якая б ацаніла беларуска-украінскія адносіны ва ўсіх перыядах суіснавання гэтых блізкіх сабе суседніх народаў, вельмі патрэбная. Хацелася б пачуць грунтоўныя аналітычныя даклады аб характары адносін Кіеўскай і Полацкай дзяржаў, змаганні за Палессе паміж навагрудскімі і галіцка-валынскімі князямі ў XIII стагоддзі, ці адказ на пытанне пра ўдзел украінскай паліцыі ў вынішчэнні жыхароў вёскі Хатынь, сімвала мартыралогіі беларускага народа падчас нямецкай акупацыі. Хаця былі зачытаны каля ста дакладаў, аднак не было вялікай дыскусіі паміж гісторыкамі двух народаў. З Украіны даехалі толькі пачынальнікі навуковай працы — аспіранты, кандыдаты навук, якія маглі прыблізіць нейкія інцыдэнтальныя справы, кранаючыя тэму канферэнцыі. Змест дакладаў беларускага боку паказваў, што беларускія вучоныя таксама непадрыхтаваныя да такой дыскусіі. Атрымліваецца, ні ўкраінцы, ні беларусы не маюць з сабой аб чым гаварыць. Гэта перш за ўсё вынік рашучага разыходжання шляхоў палітычнага і эканамічнага развіцця абедзвюх дзяржаў.

Вельмі выразна прагучала гэта падчас выступлення пасла Украіны ў Рэспубліцы Беларусь А. Дроня. Звярнуў ён увагу, што Беларусь на пачатку дзевяностых гадоў была для Украіны другім гаспадарчым партнёрам. Цяпер апынулася яна на далёкім месцы, якога пасол не быў у змозе акрэсліць. Перапісы насельніцтва ў абедзвюх краінах паказваюць, што рэзка скарачаецца колькасць беларусаў ва Украіне і ўкраінцаў у Беларусі. Гэта абазначае, што разам з абмежаваннем кантактаў пасля таго як савецкія рэспублікі сталі дзяржавамі, людзі выязджаюць на радзіму, а з другога боку таксама часцей дэкларуюць нацыянальнасць дамінуючай нацыі. У 1990 г. на Украіне пражывала 460 тысяч беларусаў, сёння іх толькі 275 тысяч. Гэта паказвае характар і тэмпы змен.

Украінскі пасол звярнуў таксама ўвагу, што да гэтай пары няма канчатковага афармлення справы дзяржаўнай мяжы паміж Беларуссю і Украінай. Падпісаны ў 1997 г. трактат яшчэ не ратыфікаваны беларускім парламентам. Ці гэта ў інтарэсе Беларусі? — як бы выпадкова спытаў пасол.

Нядобрым знакам з’яўляецца той факт, што пра важныя справы двух народаў не маглі сустрэцца і пагаварыць людзі навукі. Найчасцей гэта інтэлектуальныя эліты пачыналі дыялог. Відаць, разуменне значэння Беларусі ва Украіне і Украіны ў Беларусі амаль нулявое. Ва Украіне значэнне незалежнай Беларусі вельмі добра разумеў апазіцыйны палітык Вячаслаў Чарнавіл, які загінуў пару гадоў таму ў невысветленых акалічнасцях. У Беларусі саюз з Украінай прапагандаваў Зянон Пазьняк, але ён таксама патраціў палітычнае значэнне ў сваёй краіне. Тым часам дзяржаўнае кіраўніцтва Беларусі ад некалькіх гадоў арыентуецца на Усход, а Украіны — штораз больш выразна на Захад. Абодва бакі вяртаюцца да доўгай традыцыі ўзаемнага ігнаравання. Вынікі такога стану не цяжка прадбачыць.

Яўген Міранові ч

Але, сказаў!

У пачатку сакавіка па І праграме Польскага Радыё прэзідэнцкі міністр нацыянальнай бяспекі Марэк Сівец гаворачы аб вайне ў Іраку сказаў, што не бачыць у Польшчы нікога, хто б ішоў на вайну з песняй на вуснах. Аднак ваяваць трэба. Сказаў так, як яму ў даны момант было выгадна, чым і салгаў як абшыў! Бо я не веру, каб радавіты паляк не ведаў такіх песень: „Jak to na wojence ładnie, kiedy ułan z konia spadnie”, або „Wojenko, wojenko cóżeś ty za pani, że za tobą idą chłopcy malowani?”. Бачыце, за паняй ваенкай ідуць найпрыгажэйшыя хлопцы, каб паказацца чужым дзяўчатам!

Цяпер „хлопцы-маляваныя” пойдуць, бо я ўжо не, памагаць амерыканцам задушыць Ірак, а ўзамен атрымаюць, у тым ліку і я, вірус Эболя, які тысячы разоў горшы за сібірскую язву. І гэта можа быць апошняя дапамога падбіваць іншых, ці лепш сказаць забіваць, прынамсі на якіхсьці 1000 год, калі астануцца адно недабіткі.

Памятаю са службы ў войску, як часам салдаты спявалі: „Raduje się serce, raduje się dusza, gdy Pierwsza kadrowa na wojenkę rusza...”. Цяпер, ужо пры III Рэчы Паспалітай, у нядзельную раніцу, у перадачы для войска спявалі: „Raduje się serce, raduje się dusza, gdy Pierwsza kadrowa na Moskala rusza”. Увесь свет ведае, што кожны, хто вырушыў на маскаля, паламаў там зубы і астаўся ляжаць у рускай зямлі. Нават Напалеон шкадаваў паходу на Маскву, сказаўшы: „Зачем я шёл к тебе, Россия, Европу всю держа в руках? Тепер с поникшей головою стою на крепостных стенах...”.

Васіль Петручук

Фінская нацыянальная меншасць у Швецыі

Швецыя, Sverige, Каралеўства Швецыі — дзяржава ў Паўночнай Еўропе, ва ўсходняй частцы Скандынаўскага паўвострава, над Балтыйскім морам, якое абымае таксама Гатландыю і Аландыю і малыя прыбярэжныя астравы. На захадзе мяжуе з Нарвегіяй, на паўночным усходзе — з Фінляндыяй. Абшар — 450 тыс. км^2 (у параўнанні: Польшча — 312 тыс. км^2), насельніцтва — 8,8 млн. (Польшча — 38,6 млн.), шчыльнасць насельніцтва — 20 ас./км^2 (Польшча — 123 ас./км^2). Натуральны прырост — 0,61%. Этнічны склад — шведы — 90,8%, фіны — 2,4%, лапонцы — 1,7%. Больш за 5% — іншыя, м.інш. эмігранты. Гэтыя даныя істотныя, пры адначасовым веданні гісторыі і развіцця гаспадаркі гэтай раней прынцыпова не ўключаючайся ў справы іншых краін, нейтральнай, дзяржавы багатай, незалежна ад апошняга спаду ў развіцці эканомікі, — у разуменні становішча нацыянальных меншасцей.

Фіны жылі ў межах Швецыі на працягу сама менш апошніх 600 гадоў, бо і шэсць стагоддзяў Фінляндыя належала да Швецыі. У 1809 годзе перайшла яна пад Расію. Пасля другой сусветнай вайны ў Швецыю эміграваала да паўмільёна фінаў. Трэцяя іх частка вярнулася ў свой край і з увагі на гэтае вяртанне колькасць іх у Швецыі пастаянна зніжаецца. Мяркуецца, што цяпер у Швецыі 200-300 тысяч жыхароў, якія ў меншай або большай ступені карыстаюцца фінскай мовай.

У 60-я і 70-я гады мінулага стагоддзя ў Швецыі ўвогуле не было навучання на фінскай мове. Навучанне тое пачалося ў 1970 годзе ў Тарндалене, а ў 1975 распаўсюдзілася на рэшту краіны. У публічных школах фінская мова выкладаецца 2-3 гадзіну ў тыдзень. У першыя гады самаўрады падтрымлівалі фінскую мову ў публічным жыцці. Існуюць тры віды навучання фінскай мовы: фінская як родная мова (да 2 гадзін у тыдзень), двухмоўныя класы (1-6 класы ў пачатковай школе, палова заняткаў праводзіцца на фінскай) і класы накіраваныя на давучэнне (яны не надта прыхільна ўспрымаюцца самімі бацькамі).

У Швецыі арганізацыяй адукацыі займаецца дзяржава. Аб большасці спраў — праграмах, датацыях, сетках гадзін — рашаюць урад і парламент, а за рэалізацыяй законаў і распараджэнняў сочыць Міністэрства адукацыі. За арганізаванне і вядзенне школ адказваюць гміны. Пры кожнай радзе гміны і графства створаны спецыяльныя камітэты заданнем якіх — пільнаванне, каб школы рэалізавалі цэнтральна акрэсленыя ўказанні. Дзяржава не фінансуе школ непасрэдна — адміністрацыйныя адзінкі на месцы распараджаюцца грашыма, прызначаючы глабальна грошы на патрэбы кожнай школы. У распараджэнні дзяржавы — фонды дзеля выпраўлення розніц паміж гмінамі і грошы на дасканаленне настаўнікаў і сродкі на адукацыю калекіх вучняў, а таксама на школы для лапонцаў. Навучанне ў публічных школах бясплатнае, таксама як харчаванне вучняў, медычная апека, даезды. Усе вучні сярэдніх школ, да 20 гадоў, могуць карыстацца навуковай стыпендыяй. Шведскі закон аб адукацыі гарантуе дзецям і моладзі доступ да адукацыі, незалежна ад полу, месца пражывання, сацыяльных умоў і нацыянальнасці. Па-за справамі і стратэгіямі прынятымі парламентам і ўрадам, пра вядзенне школ вырашае гміна. Тэарэтычна гарантуецца настаўнік і праграма для ўсіх нацыянальных меншасцей (нават для паасобных дзяцей эмігрантаў; сёння, калі наступіў спад эканамічнага развіцця краіны і зменшыўся бюджэт на месцы, вядуцца заняткі на роднай мове толькі для большых груп вучняў; пры настойлівасці бацькоў і спасылцы на правы, справа вырашаецца пазітыўна). У кожнай бібліятэцы, нават у найменшай мясцовасці, ёсць кнігі на большасці моў Еўропы, таксама на арабскай, паколькі шмат эмігрантаў-арабаў.

Швецыя, у час, калі патрабавала наплыву рабочай сілы, практычна была адкрыта на ўвесь свет, давала закватараванне і грошы эмігрантам розных спецыяльнасцей. З прыняццем на працу горш — калі эмігрант не прымаў шведскага падданства і пашпрата (адмаўляючыся ад радзімы), не меў магчымасці стаць на працу, якая адпавядала яму. А дзеці, якія нават вывучалі родную мову, хутка асіміляваліся. Навучанне шведскай мовы, дарэчы, вядзецца роўна з англійскай, што, мабыць, як кажа Крыстына Андэрсан з Кунсбакі, давядзе да пэўнай уніфікацыі ў рамках Еўрасаюза. З яе даследаванняў вынікае, напрыклад, што фіны, якія трапілі ў Швецыю ў рамках эканамічнай эміграцыі, якія былі таксама і шведскамоўныя, практычна поўнасцю асіміляваліся. На заняткі па фінскай мове ходзяць вучні толькі найбольш свядомых бацькоў, найбольш на памежжы з Фінляндыяй. Цяпер, калі Фінляндыя перажывае гаспадарчую кан'юнктуру, веданне фінскай мовы карыснае — дзеці шведскіх фінаў едуць у Фінляндыю ў вышэйшыя школы, на працу. Паколькі няма практычна розніц у ментальнасці скандынаваў, толькі розніцы ў групе моў (фінская — з уграфінскай групы, абсалютна адрозная ад скандынаўскіх) маглі б быць пэўнай перашкодай, але ў час еўрапейскай уніфікацыі і паўсюднай ангельшчыны, пэўна, розніцы тыя страцяць значэнне. Так што якраз не ад самое дзяржавы залежыць — хоць запэўнівае яна развіццё меншасных арганізацый, дае правы на свабоднае вызнаванне Бога і развіццё культуры, спрыяе ў гэтым — становішча нацыянальнай меншасці ў краіне. А ад паасобных адзінак, якія ствараюць (або не хочуць па розных прычынах) тую меншасць. Тут заўважыць можна немалое падабенства нашых беластоцкіх беларусаў да фінаў у Швецыі. Незалежна ад іх саміх, Фінляндыя трапляла пад акупацыю — была шведскай, рускай. Фінскую мову ўратаваў просты народ, захоўваючы яе ў народных песнях, супольна ствараючы эпас „Калевалу". Уздымала нацыю свядомая інтэлігенцыя розных палітычных напрамкаў і веравызнанняў. Вытрымлівы народ умеў справіцца з цяжкасцямі, выжыў, сцярпеў і востры клімат, і міжнародную непагоду. Народ працавіты, здаецца, вельмі рахманы, спакойны, але ўпарты. Думаючы аб тым, каб дзецям лепш жылося. Мабыць, можна назваць іх кан'юнктуршчыкамі, бо ідуць з тымі, хто спераду, значыць, хоць рызыкуюць, могуць быць у выйгрышы... Калі, напрыклад, у 1981-82 гадах фіны ўліліся ў колькасці 250 тысяч у Швецыю, шукаючы працы, рассяліўшыся ў большых гарадах, найбольш у Стакгольме і Гётэбаргу, не стварылі небяспекі, як здавалася некаторым шведам (тады не было беспрацоўя)...

Шведскія фіны, у большасці шведызаваныя, атрымалі, мабыць, не так праз уласныя старанні, а больш праз той еўрапейскі прагрэс, магчымасць гаварыць уласным голасам. 2-3 генерацыі шведскіх фінаў — амаль практычна ўсе ўжываюць толькі шведскую мову, рэшта — двухмоўная. Хоць маюць дзве газеты, дзесяціхвілінны дзённік у галоўным выданні навін, друкуюць кнігі. У 1983 г. узнікла 630 фінскіх арганізацый (аплачваных Фінляндыяй і Швецыяй па дамове). Маюць тэатры, музычныя калектывы, танцавальныя гурты, спартыўныя клубы, шмат школ для дарослых (для тых, хто не ведаў шведскай мовы). Палітычна яны ў большасці камуністы і сацыял-дэмакраты. Спачатку сярод шведскіх фінаў былі адно рабочыя. У сямідзесятыя гады пачаліся арганізавацца настаўнікі, артысты, студэнты. Маглі ўсёй сям'ёй пасяляцца ў Швецыі, вядома, прымаючы грамадзянства.

На меншасці ідуць вялікія грошы з дзяржаўнага бюджэту і ЕС. Але, як адзначыла К. Андэрсан, большасць фінансаў паглынаюць моцна разбудаваныя ўстановы, якія даюць працу перш за ўсё спецыялістам па тых справах — па нацыянальнасцях і эміграцыі — амаль выключна шведам. Даверaным, адказным за дзяржаўную стратэгію? Саюзныя грошы ідуць туды практычна без падаткаў. Трапляюцца прадстаўнікі меншасцей часам у прафсаюзах, у сацыял-дэмакратычнай партыі, на ніжэйшых, менш адказных пасадах.

— Тыя асобы з меншасцей, якіх ведаю, мусяць ужо думаць па-шведску. І са шведскім пашпартам, — кажа К. Андэрсан, жонка шведа з Кунсбакі, родам з Беластока. — Тое, што я не аддала свой польскі пашпарт, выклікае пашану да мяне, але, на жаль, як усе, хто хоча застацца сабою, не атрымаю такое працы, як швед-грамадзянін. А ва ўстанове па справах іміграцыі, і ў Цэнтральным інфармацыйным бюро знойдзеце мноства лістовак, на розных мовах — ад фінскай па арабскую, пра тое, як Швецыя, апіраючыся на еўрапейскія законы, раўняе правы ўсіх меншасцей з уласнымі грамадзянамі. Гэта ж звычайна, па-еўрапейску. Ды і грамадзянства будзе адно — еўрапейскае.

Міра Лукша

Краявід Тарндалена

У Еўропе аднолькавых шанцаў

У рамках праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў" друкуем чарговы тэкст з цыкла 12 артыкулаў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у краінах Еўрапейскага Саюза і Польшчы. Да артыкула прыкладзена конкурснае пытанне. Аўтары правільных адказаў возьмуць удзел у штотыднёвай жарабёўцы трох кніжных узнагарод, а на канец праекта — галоўнага прызу: набору дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы. Спонсарам праекта з'яўляецца Управа Камітэта еўрапейскай інтэграцыі.

Projekt wydawniczy zrealizowano przy współpracy z Urzędem Komitetu Integracji Europejskiej w ramach konkursu otwartego dla mediów-2003.

3 конкурснае пытанне

Колькі фінскіх арганізацый ўзнікла ў Швецыі ў 1983 годзе?

Адказ: .....

Імя і прозвішча: .....

Адрас: .....

(Каб правільна адказаць на пытанне трэба ўважліва прачытаць надрукаваны побач артыкул. Адказы просім дасылаць на гэтым талоне на адрас рэдакцыі. Тэрмін дасылання адказаў — да 13 красавіка 2003 г.)

Дочкам і блізкім **МІКАЛАЯ НІКАЛАЮКА**,
намесніка старшыні Грамадскага камітэта пабудовы
Беларускага музея і Цэнтра беларускай культуры ў Гайнаўцы,
адданага дзеяча беларускай справы, нястрымнага чалавека культуры
словы сардэчнага спачування выказваюць
сябры з камітэта ды Гайнаўскага аддзела БГКТ.

Зорка

старонка для дзяцей

Авяр'ян Дзеружынскі

Красавік

Красавік.
Краса наўкола.
Зелянее
Лес вясёлы.
На бярозах,
Што ў зацішку,
Ціха лопнулі
Пупышкі,
На галінках
Трапяткіх
Паказаліся
Лісткі
Клейкія,
Ружовыя.
На лугах
Красуюць
Кветкі
Рознакаляровыя.
Смолкі тут
На ножках тонкіх,
Незабудкі
І рамонкі.
Ходзіць Янка
Па лясочку,
Дзе лятаюць
Матылёчкі.
А зязюля
Усё кувае,
Салавейка
Напявае.
Грэе сонца
З цёплай ласкай.
Красавік...
Красуюць краскі.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Выступаюць вучні ПШ н-р 4 у Беластоку

Пад бел-чырвона-белым сцягам

25 Сакавік — Свята незалежнасці Беларусі.

У Беластоку асаблівая традыцыя — свята ўшаноўваюць цэлыя сем'і: бацькі, дзеці, дзядулі, сваякі. Звычайна ўсе разам прыходзяць на святкаванне. Дзеці прыносяць з сабой бел-чырвона-белыя сцяжкі, якія ўвесь год чакаюць у дамах на гэтую ўрачыстую хвіліну.

Раней — уся праграма была для дарослых. Зараз інакш.

У гэтым годзе выпала 85-я гадавіна Беларускай Народнай Рэспублікі. Беластоцкія беларусы Свята незалежнасці адзначылі 23 сакавіка ў кавярні „Фама". Як ніколі раней, разам з бацькамі прыйшло многа дзяцей, моладзі. Нашы маладыя сябры падрыхтавалі мастацкія выступленні.

Пачалі дашкольнікі. Дзеткі з польска-беларускага садзіка спявалі і дэкламавалі вершыкі. Іх выступленне выклікала фурор.

— Я аж паплакалася, — кажа Галена Тапалянская, былая настаўніца беларускай мовы, якая прыехала з Трасцянкі.

Слёзы ўсхваляванасці былі на вачах бацькоў і сваякоў. Дзетак падрыхтавалі настаўніцы: Альжбета Гняздоўская, Данута Тымашэвіч і Анна Бабік. Дашкольнікі захапілі смеласцю і шчырасцю і за гэта атрымалі гучныя бравы.

З мастацкай праграмай выступілі і навучэнцы ПШ н-р 4 у Беластоку. Яны заспявалі славутую „Пагоню" і маршавую песню пра сцяг („Сцяг" С. Панізніка). Іх настаўніца Аліна Ваўранюк атрымала віншаванні і кветкі ад старшыні Беларускага саюза ў Польшчы за адукацыйныя поспехі.

Канцэрт папоўнілі выступленні моладзі. Выступіў рок-гурт „Ріма" з Гарадка і дзявочы калектыў „Знічка" з гайнаўскага белліцэя, пад кірункам Бажэны Ляўчук.

А калі зайграла і заспявала „Маланка" — наймалодшыя пачалі танцаваць.

Ганна Кандрацюк

Польска-беларуская крыжаванка № 14

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 10: Губа, смуга, мараль, кароль, радавы. Куст, гумар, гара, агарод, Ала, баль, даль.

Узнагароды, **аўтаручкі-cienkopisy**, выйгралі: **Юліта Давідзюк**, **Аліна Трафімюк**, **Міхал Гацута** і **Агнешка Ляўчук** з Новага Корніна, **Агата Балтрамюк** і **Пётр Паўлючук** з Дубін, **Анна Бурак** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Велікодная легенда

Недалёка ад Дубяжына, каля ракі Белкі, знаходзіцца ўзгорак. Мясцовыя людзі завуць яго „Царкоўніска". Як кажа легенда — даўно-даўно таму ў гэтым месцы была пабудавана царква. Людзі кажуць, што царква была прыгожая і ўсярэдзіне, і навонкі. Яна стаяла на багне, якая разлягалася па абодвух берагах рэчкі. У адну Велікодную ноч у царкве адбывалася ўсяночная багаслужба. Прыйшло на яе многа народу. Калі бацюшка вітаў вернікаў са святам Уваскрэсення Гасподняга, царква запалася пад зямлю разам з людзьмі, якія былі ўсярэдзіне.

З таго часу прайшло многа стагоддзяў. Аднак і цяпер можна пачуць водгаласы багаслужбы ў праваліўшайся царкве. Трэба прыкласці вуха да зямлі ў той час, калі ў Васкрэсенскую ноч вакол царквы адбываецца хрэсны ход. Тады пачуем асаблівыя галасы. Пад зямлёй, у прапаўшай калісь царкве, таксама ідзе багаслужба. Яна пачынаецца ад слоў бацюшкі „Хрыстос уваскрос" і адказу вернікаў, якога не паспелі даць — „Сапраўды ўваскрос!" Пад зямлёй гучыць спеў хору, звіняць званы. Служба працягваецца да шасці гадзін раніцы, як ва ўсіх цэрквах на нашай зямлі. Потым наступае глыбокая цішыня да наступнага Вялікадня.

Калі хочаш пераканацца, ці гэта праўда, прыедзь у Дубяжын на „Царкоўніска" ў Велікодную ноч, прыкладзі вуха да зямлі і ўважліва паслухай.

Анна Хількевіч, VI „а" кл.
бельскай „тройкі"

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Наймалодшыя дзеткі пераапранутыя за казачных герояў

Прывіталі вясну

У Падставовай школе ў Новым Корніне 21 сакавіка конкурсамі і гульнямі прывіталі вясну.

У гэты дзень у школе не было традыцыйных заняткаў. Спачатку вучні сабраліся ў спартыўнай зале, у якой арганізаваны быў конкурс моды. Выйграў яго вучань VI класа Марцін Аляксандрук, які выступіў у каляровай сукенцы і жаночых туфліках. Другое месца заняла Альжбета Прычыніч, якая з хустак зрабіла прыгожую сукенку. Некаторыя дзеткі ўвесь дзень пераапрануты былі за казачных герояў.

У сваіх класах вучні рыхтавалі мастацкія працы і складалі вершы аб надыходзе вясны. Пасля абеду адбылося падвядзенне вынікаў працы вучняў. Конкурсная камісія, якую ўзначальвала дырэктар школы Іаанна Алексяюк, абвясціла, што самымі лепшымі аказаліся мастацкія працы вучняў III, V і VI класаў. Усе ўдзельнікі конкурсаў атрымалі ўзнагароды. Былі імі ласункі. Мерапрыемства арганізаваў школьны самаўрад, якім апякуецца настаўніца Антаніна Смалюк. Конкурсы і гульні завяршыліся афіцыйным прывітаннем вясны. Дзеткі выйшлі перад школьны будынак і выпусцілі ў паветра рознакаляровыя шарыкі.

Аляксей Мароз

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Стаяць злева: Магда Галёнка, Іаанна Галёнка, Бэата Аксютыч, Марцін Мішчук, Альжбета Антанюк, Наталля Свірыдзюк, Эвеліна Дунда, Паўліна Аверчук, Пётр Герасімюк, і настаўніца Ірэна Герасімюк

Роднае слова ў Арэшкаве

7 сакавіка г.г. у Арэшкаве адбыўся дэкламатарскі конкурс „Роднае слова". Вучняў падрыхтавала настаўніца беларускай мовы Ірэна Герасімюк. У аглядзе ўдзельнічала многа вучняў — палова навучэнцаў роднай мовы. У Арэшкаве на 49 школьнікаў 28 вывучае беларускую мову. Вучні ахвотна чытаюць „Зорку", многія падпісваюцца на „Ніву".

Конкурс праходзіў у гімнастычнай зале, якую на гэты ўрачысты дзень прыздобілі вучні і настаўніца.

Смела і таленавіта выступілі наймалодшыя. У катэгорыі 0-III класаў выступіла 10 асоб, у катэгорыі IV-VI класаў 3 дэкламатары. Вучні дэкламавалі вершы Віктара Шведа, Васіля Петручука і Кандрата Крапівы.

Камісія ў саставе: Ірэна Герасімюк, Бэата Маркевіч, Кацярына Іванюк добра ацаніла падрыхтоўку вучняў. Сярод найлепшых апынуліся: Эвеліна Дунда (II клас), Пётр Герасімюк (III клас), Марцін Мішчук (V клас), Паўліна Чурак (VI клас).

Дзень, у які праходзіла „Роднае слова", прынёс многа ўражанняў і дэкламатарам, і публіцы. Вучні атрымалі дыпломы. Пераможцы прымуць удзел у раённым аглядзе ў Гайнаўцы.

Міхал Мінцэвіч

Дзённік Міколы

Прыліў гонару

Калі сёння падумаю пра канікулы, дык былі яны цалкам дарэчы.

Я і мае сябры часта ладзілі вандроўкі за горад, а ў канцы ліпеня я і мае сёстры пабывалі на дзіцячым летніку над возерам Шырокае. Летнік быў проста цудоўны, але я сумаваў за сваімі сябрамі. Даведаўся, што Аня адпачывала на моры, Томак паехаў да бабулі, Ярак у Славакію, Дамініка ў Альпы, а „Рыжыкі" — у Італію. Мае сястрыцы Рыта і Гося ўвогуле са мной не размаўлялі. Яны пазнаёміліся з нейкім Ромкам, які знелюбіў мяне з першага пагляду.

— Ваш Мікола тупы, нішто да яго не даходзіць!

Ромак не быў сімпатычным хлопцам і я думаў, чаму мае сястрыцы пасябравалі з гэткім тыпам. На шчасце, у мяне была свая кампанія. Тут, на летніку, я пазнаёміўся з Міркам Ткачыкам, які, як і я, жыў раней у Горцы. Мірак ведаў шмат пра Нор Узі. Ведаў пра Чорнага Ката і папугая. Аднак, найбольш здзівіла мяне тое... што ведаў ён пра Ліняцкіх.

— Ведаеш, — сказаў Мірак, — у нашай камяніцы ўсе пра ўсіх усё ведалі. Нашы бацькі забаранялі хадзіць пад ваш дом. Асцерагалі перад Нор Узі.

Гэтыя навіны я слухаў з недаверам. Мірак жыў у другім квартале горада, хадзіў у іншую школу і, вось, расказвае мне пра наш дом і яго сакрэты. Пра яго дом я ніколі не чуў.

— Я не слухаў бацькоў, — працягваў сябра, — і заўсёды мы разам з сябрамі прыходзілі да вашай камяніцы. Аднойчы я кінуў каменьчыкам у акно Нор Узі. Зрабіў глупства?

— Ты пра што?

— Пра што? Бо, бачыш — у Нор Узі, куды я пацэліў каменьчыкам, было усё як раней. Але калі я вярнуўся дахаты, у маім пакоі было выбітае акно. Разумееш?

— Не, — адказаў я.

Аднак, у глыбіні душы, я ганарыўся, што пра наш дом ведаюць усе жыхары Горкі, што Нор Узі — наш сябра і настаўнік.

На першым уроку беларускай мовы я напісаў пра сустрэчу з Міркам. Настаўніца ўляпіла мне „адзінку".

— Гэта за магію, — дакарала мяне спадарыня Дрот.

Я прыкмеціў, што наша настаўніца роднай мовы падобная на сястру Нор Узі.

(працяг будзе)

(нак-с)

Латышская народная казка

Лісіца-падманшчыца

Хочаш — вер, хочаш — не вер, аднойчы мядзведзь Андрыс, воўк Юрыс і лісіца Анна надумаліся пахадзіць па свеце. У дарозе ежа патрэбна, вось мядзведзь узяў з сабой пчаліную калоду, воўк ягня на спіну ўзваліў, толькі лісіца пайшла ўлегцы — думае: „Чым з сабой цягаць, спіну натруджваць — лепш я па дарозе што-небудзь украду!"

Паглядзелі скоса на яе мядзведзь і воўк, здзівіліся:

— Як жа ты, сястра Анна, без харчу пайшла?

Лісіца завохкала:

— Ах, дарагія мае! У мяне такая хвароба, што пра ежу і думаць моташна! Я ўжо і так ледзьве іду — тут баліць, там баліць!

Баліць дык баліць, што зробіш!

Ішлі яны, ішлі. Вось ужо і вечар надыходзіць. Вырашылі яны заначаваць ды паесці. Месцейка знайшлі, есці пачалі. Воўк ягня з'еў, мядзведзь за мёд узяўся, ды адразу і не адолеў — на заўтра пакінуў. А лісіца галодная лягла, сказана, хворая — ды яе і сапраўды скруціла ад галадухі.

Ну, паелі, спаць ляглі. Лісіца першая захрапла, ды хіба ў яе сон у галаве — прыкінулася, што спіць. А як толькі мядзведзь і воўк заснулі, лісіца да калоды і ўзялася за чужы мёд — усё выскрабла начыста і лапы аб воўчую морду выцерла. А потым — на сваё месца, спаць.

Вось мядзведзь раніцай прачнуўся — і за калоду. А мёду няма! Ён— да лісіцы: слава ж у яе благая!

— Паслухай, сястра Анна! Ты мой мёд з'ела? — крычыць ён. А лісіца зноў вохкае:

— Ох, тут баліць! Ох, там баліць! Што ты, браток Андрыс, ці да ежы мне — я зусім хворая. Відаць, браток Юрыс да твайго мёду дабраўся — бачыш, як спіць. І ўся морда мёдам запэцкана — зразумела чаму!

Зароў тут мядзведзь — ды на ваўка! Паставіў яго на заднія лапы і задаў дыхту — б'е ды прымаўляе:

— Свой мёд трэба есці! Свой! Свой!

„Ну, мядзведзь мне цяпер не страшны! — думае лісіца.— Вось толькі што мне з ваўком рабіць? Паспрабуй даведайся, што яму ў галаву ўзбрыдзе пасля такой лупцоўкі? Пайду я лепш адсюль!" — і бягом у лес.

Вырваўся воўк ад мядзведзя, забыў і пра падарожжа, памчаўся стрымгалоў як мага далей ад брата Андрыса. Бег, бег ды лісіцу і дагнаў. Бачыць лісіца, што не ўдасца выкруціцца ад брата Юрыса, і кажа:

— Ну, канец дык канец! Стану я, браток Юрыс, на краі ямы, а ты спіхні мяне туды.

Стала лісіца на краі глыбокай ямы. Воўк разбегся. Лісіца адскочыла ўбок. А воўк зваліўся ў яму ды там і застаўся.

І пайшла лісіца Анна, як бы нічога і не было — свае сляды рыжым хвастом замятае.

З падманшчыкам звязаўся — дабра не чакай!

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

На першым плане Мікалай Яноўскі (злева), Міхал Навіцкі і Анна Тарасюк

Жывапісцы галубінага сэрца

У Гайнаўскім доме культуры 22 сакавіка адбылося адкрыццё выстаўкі алейных прац трох мастакоў з Гайнаўшчыны — Цімафея Ціханюка, Мікалая Яноўскага і Міхала Навіцкага. Анна Тарасюк з ГДК, якая адкрывала мерапрыемства, звярнула ўвагу на загаловак выстаўкі „Жывапісцы галубінага сэрца". Спалучае ён любоў аўтараў прац да акружаючага асяроддзя.

Цімафей Ціханюк нарадзіўся ў 1908 годзе ў Зубаве. Гаспадарыў у Койлах, а ў вольны час рысаваў і маляваў. Памёр ён у 1976 годзе. Побач карцін, якія паказваюць звычайнае жыццё, вісяць партрэты і краявіды.

— Наш дзедка не толькі маляваў. Любіў чытаць рэлігійную літаратуру і гістарычныя кнігі. Многа напісаў ікон, — сказаў Вітальд Ціханюк. — Яго іконы знаходзяцца ў часоўні ў Койлах і ў царкве на могілках у Чыжах. На выстаўцы паказаны алейныя працы на паперы, а ў сямейных калекцыях маюцца карціны на палатне, графіка і іконы. Засталіся таксама дзённікі і рускамоўныя вершы.

Мікалай Яноўскі жыве ў Старым Беразове. Раней працаваў аграномам у Чыжоўскай гміне, цяпер на пенсіі. Прабаваў маляваць у маладосці, але больш сур'ёзна заняўся мастацтвам, калі стаў пенсіянерам. На выстаўцы знаходзяцца яго аўтарскія працы і копіі вядомых карцін. Палюбіў маляваць краявіды і карціны з дынамічным сюжэтам. Мастак аднаўляе таксама старыя карціны.

Міхал Навіцкі 5 гадоў таму пераехаў са Свінарояў у Гайнаўку. Маляваў пушчу, коней і аўтапартрэты. Пісаў таксама іконы, якія прадаваў нават у Нямеччыну. Спачатку выконваў акварэльныя працы, а пасля пачаў маляваць алейныя карціны. Зараз малюе дамы і кватэры, а мастацтвам займаецца ў вольны час.

Аляксей Мароз

Лукашэнка пашкадаваў мастакоў

Пасля ўступлення ў дзеянне Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 495 „Аб удасканаленні парадку вызначэння памераў арэнды" жыллёва-эксплуатацыйныя службы (так званыя ЖЭСы) разаслалі беларускім мастакам адмысловыя лісты, у якіх у пагрозлівай форме прапанавалі творцам тэрмінова перазаключыць дамовы на арэнду майстэрняў на новых умовах — 2,5 еўра за квадратны метр плошчы. Гэта выклікала паніку і шматлікія акцыі пратэстаў у мастацкім асяроддзі. Шмат хто з творцаў ужо адмовіўся ад сваіх майстэрняў!

— Я атрымаў такі ліст з ЖЭСу, — прызнаў вядомы гродзенскі жывапісец Аляксандр Сільвановіч, — і быў вельмі здзіўлены ягонай катэгарычнасцю! Бо ў выпадку, калі я не перазаключу дамову на прапанаваных новых умовах, дык „справу" перададуць у суд! Мая майстэрня мае плошчу 70 кв. метраў плюс камунальныя паслугі — тады я павінен заплаціць недзе 200 еўра ў месяц. Ну гэта ж абсурд, абсалютна непад'ёмная сума!

Атрымаўшы такія лісты, гродзенскія мастакі (указ тычыцца мастакоў з усёй Беларусі — аўт.) склалі *свой* ліст і звярнуліся да старшыні гродзенскага гарвыканкама Аляксандра Антоненкі. Гаворка вялася не толькі пра майстэрні, але і пра лёс галоўнай выставачнай залы Гродна плошчай 283 кв. м., якую нават пры старых коштах на арэнду было праблематычна ўтрымаць абласному аддзяленню Саюза беларускіх мастакоў.

— Калі б мы перазаключылі гэтую забойчую дамову, — паведаміла дырэктарка гэтай выставачнай пляцоўкі Марыя Мацко, — была б катастрофа, бо і так на ладан дыхаем. Але з'явілася надзея — аддзел культуры гарвыканкама ўсё ж бярэ залу на свой баланс.

Такім чынам таварыш Антоненка адрэагаваў, што „гарвыканкам улічвае неабходнасць захавання ў памяшканні па вуліцы Ажэшкі выставачнай залы". Аднак, як вынікае з ягонага адказу, арэнда майстэрняў павінна аплачвацца мастакамі на агульных правах. Вядома, чыноўнікі гарадскога і абласнога ўзроўняў „гатовыя і радыя шчыра дапамагчы мастакам", але не могуць паперці супраць прэзідэнцкага ўказа. На гэтым бюракратычнае кола павінна было замкнуцца ўдаўкаю на шыях майстроў пэндзля і алоўка.

— Не бачачы выйсця з сітуацыі, я звярнуўся да намесніцы старшыні гродзенскага аблвыканкама Марыі Біруковай, — гаворыць старшыня абласнога аддзялення Саюза беларускіх мастакоў акадэмік скульптуры Уладзімір Панцялееў. — Яна якраз курыруе пытанні культуры, і з прычыны крызіснай сітуацыі склікала ўсіх адказных чыноўнікаў і правяла нараду, на якой разглядаліся ўсе аспекты незайздроснага становішча мастакоў. Зараз чакаем папераў ад рэспубліканскай камісіі з пацвярджэннем ільготнай аплаты на арэнду мастацкіх майстэрняў...

Ходзяць чуткі, што знайшоўся сапраўдны дабрадзей — старшыня Брэсцкага аблвыканкама Васіль Даўгалёў, які выратаваў усіх прафесійных мастакоў Беларусі! Вялікі аматар жывапісу, ён зразумеў усю бязглуздасць Указа № 495 у адносінах да творцаў, пабачыўшы квіткі з коштамі за майстэрні. Больш таго, кажуць, з гэтымі квіткамі ён пашыбаваў у Мінск на аўдыенцыю да самога Лукашэнкі. Прэзідэнт, да якога ўжо звярталіся ў гэтай справе вядомыя акадэмікі і народныя мастакі Беларусі, не жадаючы паўтараць глупстваў сваіх дарадцаў падпісаў паперу на ільготную аплату арэнды майстэрняў для прафесійных мастакоў. Вызначаны памер — 0,25 еўра за кв. метр плошчы. Але ці распаўсюдзіцца гэтая „ільгота" на ўсіх беларускіх мастакоў — пакуль невядома.

Людвік Сарока

Абнаўленне ў бібліятэцы

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ірэна Ігнатовіч (справа) і Галіна Іванюк побач беларускага куточка

Змены ў школьнай бібліятэцы і чытальным зале Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы заўважальны не толькі пастаянным чытачам. За школьныя сродкі купілі стэлажы і памянялі мэблю. З Міністэрства адукацыі атрымалі камп'ютэры, якімі карыстаюцца вучні ў чытальным зале. Бібліятэкары Ірэна Ігнатовіч і Галіна Іванюк выдзелілі стэлажы з беларускімі кніжкамі і пачалі папаўняць іх новымі выданнямі.

Зараз у беларускім куточку знаходзяцца літаратурныя творы, матэрыялы па геаграфіі і гісторыі. У бібліятэцы сабіраюцца беларускамоўныя артыкулы з газет, якія тычацца белліцэя. Кніжкі атрымоўвалі ад гасцей з Беларусі і куплялі ў бібліятэцы Беларускага музея ў Гайнаўцы. Свае выданні дорылі белліцэю Віла Сакратэс, Беларускае гістарычнае таварыства, Беларускі саюз у РП і „Ніва".

— Некаторыя вучні цікавяцца беларускай літаратурай. Найчасцей чытаюць творы Коласа, Купалы, Шамякіна, Мележа, Крапівы і „белавежцаў", шукаюць кніжак, якія можна выкарыстаць у падрыхтоўцы да дэкламатарскіх ці прадметных конкурсаў і да экзаменаў па беларускай мове на атэстат сталасці, — кажа Ірэна Ігнатовіч. — У чытальным зале праводзяцца ўрокі беларускай мовы з выкарыстаннем камп'ютэраў і беларускіх кніжак.

Школа атрымала каля тысячы кніжак з зачыненай бібліятэкі Вайсковай часці ў Нязнаным Бары. У бібліятэку паступае каля 40 найменняў часопісаў, аўдыёкасеты, відэакасеты і кампакт-дыскі. У будучыні можна будзе выдаваць кніжкі, выкарыстоўваючы камп'ютэрную праграму „Моль 2000". Інфарматык Міхал Смык і бібліятэкары ствараюць школьны цэнтр інфармацыі. У камп'ютэрную базу даных заносяць інфармацыю аб кнігазборы (каля 18 тысяч).

У чытальным зале адбываюцца спатканні з цікавымі асобамі. Нядаўна сустрэўся з моладдзю былы настаўнік Аляксандр Харкевіч. У планах спатканне са старастам Гайнаўскага павета і бурмістрам горада.

Аляксей Мароз

Міхалова

Бібліятэцы — 55

Сёлета Гмінная публічная бібліятэка ў Міхалове святкуе 55-годдзе існавання. Паўвека назад знаходзілася яна ў будынку збудаваным у 1835 годзе па вул. Геранімоўскай (стаіць ён па сённяшні дзень).

Першым бібліятэкарам быў Вацлаў Грыка, потым Юлія Матыс, а зараз шматгадовай кіраўнічкай з'яўляецца Ніна Тарасэвіч. У Гміннай бібліятэцы працуюць таксама Тэрэса Рыбінская і Алла Бяленя. Філіялы вядуць Анна Аўрук у Шымках і Ірэна Матвяюк у Бандарах.

Цяпер у Гміннай публічнай бібліятэцы 21-тысячны кнігазбор. Апрача гэтага філіял у Шымках налічвае 10,5 тыс. тамоў, а ў Бандарах — 7,2 тыс. У Міхалове кнігасховішчам карыстаецца 776 чытачоў і ў яго філіялах — 306.

У мінулым годзе міхалоўская ГПБ купіла 1 175 кніжак. Арганізаваўся аддзел спецыяльных збораў. У ім „Манаграфія Міхалоўскай гміны" Лешка Носа, былога старшыні Таварыства сяброў Міхалоўскай гміны, „Легенды Міхалоўскай гміны" і рэгіянальныя выданні, мемуары, дзённікі, фотакартачкі, папкі з выразкамі артыкулаў з рэгіянальных газет і часопісаў.

У бібліятэках адбываюцца культурна-асветныя мерапрыемствы, між іншым, дэкламатарскія і пластычныя конкурсы, гутаркі на тэму кніжак і пісьменнікаў, вечарыны казак для дзяцей.

У сувязі з юбілеем бібліятэкі, яе кіраўнічка падрыхтоўвае ў маі аўтарскую сустрэчу з мясцовымі літаратарамі, адпаведныя акалічнасці насценгазеты і конкурсы.

Янка Целушэцкі

Тамаш Зан, вечны пілігрым

Дарога да магілы Тамаша Зана нагадвала шлях праз джунглі. На могільнік мы пралезлі дзіркай у плоце, пасля, крок за крокам, прадзіраліся праз высокі маліннік, кустоўе. З-пад ног шмыгалі яшчаркі, па твары сцябала крапіва, біў калючы ажыннік.

Паэт-рамантык пахаваны на старых могілках у Смалянах. Яго магіла ўжо ў XIX стагоддзі была месцам культу, сустрэнем яе на карцінах Напалеона Орды. Сюды цягнулі паломнікі з усіх куткоў Літвы і Кароны — літаратары, паўстанцы, пазітывісты, закаханыя.

* * *

Апошнія гады жыцця Тамаш Зан правёў на Аршаншчыне, у маёнтку Каханыч. Двор знаходзіўся 29 км ад Оршы, непадалёк Смалян. Нам не пашанцавала адшукаць месца.

Тамаш Зан пражыў у Каханычы 9 гадоў. Пасяліўся там пасля шлюбу з Брыгідай Свентажэцкай, ужо на схіле гадоў. Гісторыя знаёмства — як сюжэт рамантычнага твора.

Легендарны філарэт, герой Міцкевічавых „Дзядоў", вяртаўся пасля семнаццаці гадоў ссылкі з Урала і Расіі. У шляхецкім асяроддзі віталі яго як жывую легенду, як героя, які вярнуўся з іншага свету. У адным з маёнткаў пазнаёміўся з маладзенькай Брыгідай Свентажэцкай, паненкай з маёнтка Маліноўшчына, расчытанай у рамантычнай літаратуры.

— Я ўбачыў у ёй Літву, святло, якое вітае свайго сына з выгнання, убачыў у ёй анёла, які нагадвае мне маю маладосць, боства, якое прадказвае мне шчаслівую будучыню, — пісаў паэт сяброўцы Марылі Путкамер (*vel* Марылі Верашчака з Туганавіч, музе Адама Міцкевіча).

Павянчаліся пасля пяці гадоў знаёмства. У якасці шлюбнага падарунку бацькі жонкі купілі маёнтак Каханыч — у Белай Русі, як у палове XIX ст. называлі ўсходнія землі гістарычнай Літвы.

* * *

Раней Тамаш Зан, як мала хто з рамантыкаў, крочыў драпежнымі і небяспечнымі сцежкамі жыцця.

Нарадзіўся ў шляхецкай сям'і на Маладзечаншчыне. У біяграфіі цяжка раздзяліць легенду і праўду. Адна з версій апавядае, што радзіўся ў дарозе, дакладней, у карчме ў вёсцы Мясата. Кацярына Зань, жонка паўстанца, хаваецца ад казакоў. Пасля родаў вымушана ўцякаць у лес. На двары мароз, сцюжа (дата нараджэння Тамаша — 21 студзеня 1796 года). Жыццё ратуе ім выпадкова напатканая ў лесе сялянка, кабета будзе грудной мамкай Тамаша.

Сям'я вечна перамяшчаецца з месца ў месца. Пазбаўлены маёнтку паўстанец Караль Зань (так гучыць сямейнае прозвішча) знаходзіць працу аканома ў маёнтку Вязань на Маладзечаншчыне. Нейкі час Тамаш жыве ў Уздзе, у бацькоў маці, і там ходзіць у парафіяльную школу. У 1807 годзе разам з малодшым братам Ігнасём пачынае вучыцца ў Мінску, у польскай гімназіі. Належыць да найбольш здольных вучняў. Тут знаёміцца з братамі Міхалам і Юзафам Верашчакамі, братамі Марылі, музы Адама Міцкевіча.

* * *

1812 год. Тамаш, вучань павятовай школы ў Маладзечне, у баявым настроі вітае армію Напалеона. Разам з братамі жыве ў горадзе, пад пільным вокам бабулі. Ужо тады піша „неблагонадежные" вершыкі. Зневажае ўрад, маскалёў. Сярод аднагодкаў арганізуе вайсковую гульню ў „Марса і Апалона". Рускія войскі пад знакам Марса ўвасабляюць сабой грубую, чорную сілу, польскія — святло і любоў — пад кірункам Апалона, бога любові. На чале арміі Апалона, вядома — Тамаш Зан. Бацькі, якія арандуюць фальварак у недалёкім Іверы, студзяць запал. Усякімі спосабамі схіляюць да навукі.

У 1815 г. Тамаш паступае на фізікаматэматычны факультэт Віленскага універсітэта.

У першы год навучання бачым яго ў Таварыстве шасцёх. Пасля, разам з сябрамі арганізуе Таварыства філаматаў і Таварыства прамяністых, якое з часам стануць называць Таварыствам філарэтаў.

Цікавы этнічны састаў пачынальнікаў польскага рамантызму. Са 135 чалавек арыштаваных царскай паліцыяй 113 чалавек з Беларусі (Віленская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская губерні і Беластоцкая вобласць), з Каралеўства Польскага 6 асоб, з Украіны — 16.

Сярод філаматаў адзіны „неліцьвін" гэта ўкраінец Юзаф Яжоўскі.

Перад дарогай у ссылку філаматы спяваюць беларускую песню — „Да лятуць, лятуць да дзікія гусі" — песня выклікае расчуленасць і агульны плач.

* * *

У 1815 годзе Тамаш Зан піша гімн „Марш Апалонавага войска". Адкрыта заклікае змагацца з царызмам. Каб прыцягнуць моладзь да палітыкі, арганізуе Таварыства прамяністых. Згуртаванне, на пачатку, ставіць сабе адну мэту — маральнае ўдасканаленне. Сэнс прамяністасці тлумачыцца так: кожны добразычлівы, высокай маралі чалавек выпраменьвае святло. Ён тым самым дабратворна ўплывае на іншых. Адным з 15 правіл ёсць вернасць і прыхільнасць да айчыннай зямлі.

Сваю праграму філарэты рэалізуюць у прыцягальнай форме. Ладзяць маёўкі, забавы, танцы, пагулянкі. Арганізацыя расце ў вачах. Дзеля жарту і канспірацыі філаматы называюць „забавай" палітычную антыцарскую дзейнасць.

Рух закранае Беласточчыну. Міхал Рукевіч з маёнтка Завыкі каля Беластока піша ў 1822 г. Тамашу Зану:

„Нічога апрача забавы я не раблю. У гэтай забаве заняты са мной некалькі чалавек. Мы разважаем над сродкамі, якія памаглі б грамадству не сумаваць, асабліва тым, хто гэтак жа, як і мы, зрабіў забаву мэтай свайго жыцця.

Паколькі ні ў Гародні, ні ў Беластоку, губернскіх гарадах, няма ніякіх забаў, мы намерыліся паміж імі, пасярэдзіне, распачаць забавы. Ёсць якраз за міляў 6, ад Беластока на вялікім павятовым тракце мястэчка Саколка, дзе заўсёды добра забаўляюцца і дзе ўжо адбылося некалькі маскарадаў.

У нашай беластоцкай акрузе ёсць яшчэ два павятовыя мястэчкі — Бельск і Драгічын. Ёсць звесткі, што і там думаюць пра забавы".

* * *

У час арышту і допытаў у 1823-24 гг. Тамаш Зан бярэ ўсю адказнасць на сябе. Чын і словы высакароднага „Тамаша" ўпамінае ў III частцы „Дзядоў" Міцкевіч:

Я вамі кіраваў, каб збыць няволі путы,
І абавязак мой — за вас прыняць пакуты.

Пакаранне ў Арэнбургскай крэпасці не зломіць баявітага „прамяністага". Пасля выхаду з турмы Зан захапляецца навукай. Уплыў на яго мае нямецкі вучоны Аляксандр Гумбальт. Наш рамантык вывучае геалогію і батаніку. Неўзабаве яму даручаюць геалагічную разведку на шырокіх прасторах Прыуралля, Тургайскага стэпу. Легендарны Тамаш зноў праяўляе геніяльнасць. На Волзе пад Самарай знаходзіць нафту, у Зауральскім стэпе — багатыя залежы золата, каля Троіцкай Крэпасці — медную руду. Стварае багаты мінералагічны музей у Арэнбургу.

За заслугі ў вывучэнні Урала і асабліва за знаходку золата цар дазваляе вярнуцца ў Расію. З 1837 г. жыве ў Пецярбургу, на Літву вернецца праз чатыры гады.

* * *

Шчаслівая будучыня, якую сабе прадказваў пасля сустрэчы з Брыгідай, не цалкам споўнілася. У лістах да сяброў легендарны паэт і ваяр наракаў на нуду, адзіноту.

— Я адарваны ад родных і блізкіх, вязень над Віліяй, хворы над Нёманам, чыноўнік над Дзвіной, — пісаў Марылі Путкамер. — Не прытуліла мяне сяброўства на Літве, вялікая справа на Жмудзі, свяцтва і вучоная сябрына на Чорнай, грамадства і набожнасць над Дзвіной і на Белай Русі. Няўжо ж, пакуль жыву, буду вечным выгнаннікам і пілігрымам.

Тамаш Зан пахаваны з жонкай і дзесяцігадовым сынам. Салідныя, каменныя помнікі парастае буйны маліннік. У час нашай пабыўкі праз сцяну дзікай расліннасці прабілася сонца. На міг апанаваў нас архіпраменны бляск.

Ганна Кандрацюк

* Крыніцы: *Філаматы і Філарэты*, зборнік (біяграфіі, творы, лісты ў апрацоўцы Кастуся Цвіркі).

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ля магілы Тамаша Зана і яго родных

Мал. НАПАЛЕОНА ОРДЫ

Добра справіліся

У ваяводскіх элімінацыях прадметнага конкурсу беларускай мовы прынялі ўдзел 6 вучняў падставовых школ. Усе фіналісты добра напісалі свае працы і сталі лаўрэатамі.

Змаганні вучняў праходзілі 19 сакавіка ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім. Дзеткам трэба было напісаць аб'яву пра пасадку лесу, з раскінутых сказаў скласці дыялог і разбудаваць некалькі сказаў. Вучні працавалі таксама з тэкстам. Шукалі ў ім галоўнай думкі, выпісвалі названні дрэў і давалі загаловак.

— Цяжкаватым было напісанне дыялога, а найлягчэй было выпісваць з тэксту назвы дрэў і разбудоўваць сказы, — заявілі вучаніцы бельскай „тройкі " Аляксандра Лаўранюк і Анна Кандрацюк.

— У агульным пытанні былі лёгкімі, — кажа Міхал Каліна з Падставовай школы н-р 4 у Беластоку. — Не рыхтаваўся я па граматыцы, бо граматычных пытанняў не было на раённых элімінацыях. Многа чытаў, каб лепш засвоіць беларускія словы.

Юліта Сахарчук з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім гаворыць, што рыхтуючыся да конкурсу перабудоўвала сказы, чытала тэксты і аналізавала іх. Іншыя вучні таксама працавалі дома з тэкстамі. Перакладалі тэксты з польскай мовы на беларускую, рыхтаваліся адказваць пра мастацтва, спорт і тэатр.

— Падабаецца мне беларуская мова і гэты конкурс. Люблю я чытаць беларускія кніжкі і спяваць беларускія песні, — кажа Моніка Сухар з Падставовай школы ў Орлі. Яна — вучаніца V класа. У наступным годзе таксама будзе прымаць удзел у беларускім конкурсе.

— Ад вучняў патрабавалася разумення і аналізу тэксту, — заяўляе старшыня конкурснай камісіі Тамара Русачык. — Узровень складанасці пісьмовых прац прадбачаны быў для вучняў IV-VI класаў, але настаўнікі вельмі добра падрыхтавалі вучняў. Дзеткі справіліся на медаль. Даказалі, што лагічна думаюць, добра ведаюць і любяць беларускую мову.

Камісія ў складзе Тамара Русачык, Людміла Грыгарук і Ніна Абрамюк, сцвердзіла, што максімальную колькасць балаў набрала Моніка Сухар. На адзін бал менш набралі Анна Кандрацюк і Юліта Сахарчук, а на два балы менш Міхал Каліна і Аляксандра Лаўранюк. Вучні гэтыя атрымаюць самыя высокія ацэнкі па беларускай мове на заканчэнне вучобы. Конкурсныя пасведчанні дадуць ім магчымасць атрымаць дадатковыя балы ў час паступлення ў сярэднюю школу.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Каманда пераможцаў у пляценні „касы" з Масленіцай — Аннай Садоўскай

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вучнёўская сямейка за сталом з блінамі

Масленка

У нас сёння Масленіца
прыляцела ластавіца.
Села, пала на жэрдачку,
шчабятала вестачку...

Масленіцу святкавалася ў апошні тыдзень перад Вялікім пастом. Гэта першае веснавое свята, якое завяршае зіму і ўслаўляе прыход вясны, сонца і цяпла. Масленіца святкавалася на працягу тыдня і называлася „шырокай". Яна была цесна звязана з праваслаўнай абраднасцю — праз гэты тыдзень елі малочныя прадукты, бліны, аладкі. Яшчэ тыдзень паней паводле царкоўных законаў трэба было развітацца з мясам.

На жаль, абраднасць нашых продкаў, у гэтым і Масленіца, памаленьку занікае. На шчасце адрадзіць гэты старадаўні звычай нашых продкаў стараецца моладзь. У зале, прыбранай пад вясковую хату, з'яўляюцца гаспадар з гаспадыняй і стаўляюць на стол малако, бліны, аладкі. Пасля да іх далучаюцца госці, каб разам з гаспадарамі выглядаць Масленіцу. Калі ўжо надыходзіць Масленіца, дык усе разам садзяцца за стол. Гаворка ідзе пра ўраджай лёну, жыта, пшаніцы, агуркоў. Усе жадаюць адзін аднаму боскай дапамогі ў працы, а таксама вясёлай гульні ў цёплыя, веснавыя дзянёчкі. Каб госці і сама Масленіца не сумавалі, гаспадары з гасцямі спяваюць карагодную песню, а пасля адгадваюць загадкі, гераіняй якіх кароўка. Сярод жартаў, смехаў і вясёлай музыкі кароўка з Масленіцай танцуюць. На канец, пасля застольнай бяседы, госці развітваюцца з гаспадарамі і адыходзяць.

За сталом застаецца шчаслівая Масленіца, якую прывіталі прыказкамі і прымаўкамі, напрыклад, „Масленка-палізуха: сыр і масла палізала"; „Масленка з блінамі, а пост з грыбамі"; „Пост падняў хвост, а мне Масленіца". Гэта быў першы дзень Масленіцы, названы „Сустрэчай" ці „Стрэчаннем", у які Масленіцу сустракалі і ўслаўлялі. Сама Масленіца забаўляла людзей, выцягваючы з кошыка загадкі.

Другі дзень Масленіцы называўся „Зайгрышы" ці „Заговіны". У гэты дзень з гор каталіся, каб добры лён рос.

У сераду, на Масленіцу, цешчы пяклі бліны і запрашалі сваіх зяцёў у госці. Бліны былі галоўным пачастункам на Масленіцу, таму што яны вельмі падобны на сонца, якому людзі рады пасля доўгай зімы.

Чацвёрты дзень Масленіцы называўся „Дзень святога Уласа". Лічылася, што ў гэты дзень павінен прасяваць першы жаваранак. Ушаноўвалі таксама маладых людзей, якія пажаніліся ў гэтым годзе, а мужчыны хадзілі ў лазню (зразумела з венікам). На Масленіцу быў звычай „калодкі вешаць". Вешалі звычайна тым хлопцам, якія яшчэ не ажаніліся.

Масленічная пятніца называлася „Цешчыны вячоркі". У гэты дзень зяці сваіх любімых цешчаў у госці запрашалі і частавалі блінамі.

Масленка забаўляла сваіх гасцей і не сядзела з апушчанымі рукамі. Кожнаму дзянёчку прыпісваліся асобныя гульні: у аўторак каманды выпляталі „касу" з ільну, у сераду адгадвалі колькі бліноў на талерцы і выпівалі праз саломінкі навыперадкі малако. У чацвер хлопцы адказвалі на загадкі прысвечаныя лазні, звязвалі венікі. Таму хлопцу, які ў „венікавай" гульні прайграў, вешалі калодку і ён мусіў ад яе адкупіцца. Але гэта не было апошнім конкурсам-гульнёй. У пятніцу хлопцы (будучыя зяці) пяклі бліны сваім цешчам, гэта значыць, мелі паставіць патэльню на крэсла. Аднак цешча захацела мець бліны з пылу і з жару — хлопцы мусілі паставіць патэльню ў печ (пад крэсла). Пераможца атрымоўваў на памяць смачны бліночак, а той хлопец, які прайграў, выбіраў сабе сярод прысутных дзяўчат нявестку.

На шосты дзень Масленіцы нявестка збірала да сябе ў госці ўсю мужаву радню. У „гайнаўскай" Масленіцы нявестка і жаніх запрашалі да сябе ўсю сям'ю: сватоў, братоў, кумоў, бацькоў, дзядзечак і ўсе яны разам весяліліся, танцуючы польку.

Апошні, сёмы дзень Масленіцы, называўся „Прабачальная бяседа". У гэты вечар усе родныя прасілі прабачэння адзін у аднаго. Паколькі гэта быў апошні дзень Масленіцы, дык і сама Масленіца прасіла прабачэння сваіх грахоў.

Свята Масленіцы завяршылася развітальнымі словамі:

Даражэнькія госці, бывайце —
Варэнікі, бліны спажывайце.
Масленіцу ўспамінайце
Ды праз год на нас чакайце.

Анна Садоўская

Святкаванне Масленіцы

— Вось і дачакаліся мы з вамі вясёлай Масленкі, з блінамі, маслам, варэнікамі, — заявілі гімназісты з Комплексу школ распаложанага па вуліцы Новаваршаўскай у Гайнаўцы адкрываючы мерапрыемства ў Гайнаўскім беларускім музеі. Разам з бібліятэкарам Наталляй Герасімюк і настаўніцай беларускай мовы Людмілай Грыгарук падрыхтавалі яны 8 сакавіка 2003 г. масленае прадстаўленне. Вучні вырашылі адзначаць маслены перыяд згодна з традыцыяй, на працягу сямі дзён.

— Вучні аказаліся вельмі таленавітымі акцёрамі. Убачылі мы іх інтэрпрэтацыю сцэнічнага мантажу, да якой я мала дакраналася, — заявіла Наталля Герасімюк.

Публіку, сярод якой сабраліся вучні, іх сямейнікі, дырэктар школы Ірэна Кулачэўская, асветны інспектар з Гайнаўкі Нэля Шчука і настаўнікі, частавалі блінамі. Мерапрыемства закончылася выступленнем хору „Арыент" з Мінска, які заспяваў беларускія народныя песні. Гайнаўскіх вучняў з масленым прадстаўленнем запрасілі яшчэ ў Старое Ляўкова.

(ам-з)

Падрыхтавалі навуковую працу

У снежні 2002 года выпускнікі Гімназіі ў Дубінах атрымалі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі ў Варшаве ўзнагароду за навукова-даследчую працу „Мова нашага рэгіёна. Суіснаванне беларускай гаворкі і польскай мовы". Арганізатарам конкурсу было Таварыства пошукавых гімназій з малых гарадоў і вёсак з Аляксандрава-Лудзкага. Працу падрыхтаваў вучнёўскі калектыў пад кірункам настаўніцы беларускай мовы Ніны Куптэль.

Узнагароду атрымалі (злева) Рэната Харытанюк, Анэта Міцэвіч, Паўліна Швед і настаўніца Ніна Куптэль

Год раней вучні трэціх класаў Гімназіі ў Дубінах апісалі мясцовыя гаворкі. Гімназісты падрыхтавалі апытальнік, на падставе якога даследавалі фанетычныя і лексічныя адметнасці гаворак навакольных вёсак. Апыталі яны жыхароў Дубін, Ласінкі, Нараўкі, Арэшкава і Махнатага, гаворкі якіх вылучаюцца фанетычнымі адметнасцямі. Моладзь заўважыла, што найбольш падобныя да беларускай літаратурнай мовы дыялекты Нараўкі і Ласінкі, а ў арэшкаўскай гаворцы знайшлі некаторыя прыкметы характэрныя ўкраінскай мове. Вучні пазначылі на карце Гайнаўскага павета месцы, дзе захавалася дзеканне, цеканне і аканне.

— Штораз менш моладзі гаворыць пасвойму. На ўроках вучні саромяцца размаўляць на гутарковай мове. У час доследаў у гімназістаў узмацнілася беларуская свядомасць. Вучні ўпэўніліся, што вясковая мова з'яўляецца беларускай гаворкай, а бацькі і дзяды — беларускай нацыянальнасці. Дазволіла гэта лепш зразумець чаму мы вучымся ў школе беларускай мове, — заявіла настаўніца Ніна Куптэль.

У Дубінах звыш паловы вучняў школы і гімназіі ходзіць на заняткі беларускай мовы. У час школьных мерапрыемстваў вучні выступаюць на беларускай мове. У калектыве, які рабіў доследы, працавалі Павел Плева, Марк Кот, Рэната Харытанюк, Паўліна Швед і Анэта Міцэвіч. Вучні, якія падвялі вынікі апытанняў, прыйшлі да вываду, што каля Гайнаўкі дзядулі і бабулі гавораць найчасцей па-беларуску. Бацькі вучняў размаўляюць на беларускай і польскай мовах, а большасць іх равеснікаў найчасцей гавораць па-польску. Па-свойму моладзь найбольш гаворыць у Махнатым і Беразове.

Вучні і настаўнікі Гімназіі ў Дубінах раней арганізавалі ў школе спатканне з фальклорным калектывам „Арэшкі". Спачатку выступілі жанчыны з Арэшкава, а пасля вучні расказалі пра вясковыя абрады звязаныя з вясеннімі святкаваннямі. Арэшкаўскія самадзейніцы ўспаміналі колішняе вясковае жыццё. Школьнікі з Дубін ездзілі ў Пераходы, дзе пазнаёміліся з ткацкім рамяством. Восенню ў дубінскай школе быў арганізаваны сямейны фэст, у час якога вучні выступалі з восеньскімі гульнямі.

Аляксей Мароз

Фільмавы вечар

Красавік з яго зменным надвор'ем — найлепшая пара, каб не сядзець самому ў чатырох сценах, а толькі разам з сябрамі або кімсьці блізкім выбрацца ў кінатэатр. На гэты тыдзень прапаную чатыры фільмы, якія ўчыняць прыемнымі красавіцкія халодныя дні.

„Лавелас" (*Tadpole*) у рэжысуры Гары Вініка пераносіць нас у Нью-Йорк, дзе пятнаццацігадовы Оскар перажывае першую любоў. Праблема аднак у тым, што юнак улюбіўся ў саракагадовую Дыяну, найлепшую сяброўку мачыхі.

Оскар, які ў школе дасведчыў непрыемнасцей ад дзяўчат („яны толькі патрапяць дурнавата смяяцца") даходзіць да вываду, што шчасце можа знайсці дзякуючы вопытнай жанчыне. Інтэлігентны хлопец пачынае небяспечную гульню...

З поўнай ангажаванасцю і ўпартасцю заваёўвае сэрца здзіўленай Дыяны, а пры нагодзе даходзіць да вываду, што падабаецца яму і мачыха! Але ў жыцці ўсяляк бывае і Оскар спатыкае аднойчы маладую Клер і... А што было далей пабачце самі!

„Дзікая нявіннасць" (*Savage Innocence*) Філіпа Гарэля — гэта прапанова для аматараў жахалак. Галоўны герой, Франсіс — чалавек, які пражыў многа ў сваім жыцці. Трыццацігадовы кінарэжысёр не можа прыйсці ў сябе пасля смерці жонкі, якая памерла ад празмернай дозы наркотыкаў. Паяўляюцца і праблемы на рабоце. Франсіс не можа зрэалізаваць фільмавы праект, заснаваны на гісторыі яго жонкі, які б перасцерагаў перад наркотыкамі.

Аднойчы аказваецца, што Франсіс можа зняць свой фільм за грошы з наркабізнесу. Як трымаць сябе ў такой сітуацыі, якую выбраць дарогу, што з'яўляецца большым злом.... Фільм дае адказ на ўсе пытанні.

„Дзённікі Вацлава Ніжынскага" (*The Diaries of Vatslav Nijinsky*) аўтарства Пола Кокса — гэта прадстаўленая ў прафесійны спосаб гісторыя жыцця Вацлава Ніжынскага — вядомага балетнага танцора і харэографа.

Ніжынскі, па паходжанні паляк, разам з бацькамі, таксама танцорамі, па палітычных прычынах апынуўся ў Расіі. Малады чалавек аказаўся быць таленавітым і ахвотным да вучобы, дзякуючы чаму прыцягнуў увагу Сяргея Дзягілева, які запрапанаваў яму ролю саліста ў балетнай групе.

Дзякуючы рэжысёру, які засяродзіўся на дзённіках Ніжынскага, пабачым расчараванне рэчаіснасцю чалавека, які ў пэўны момант стаў называць сябе Богам.

„Эўрыка" — фільм японскай прадукцыі, прадстаўляе гісторыю ўгону школьнага аўтобуса псіхічна хворым чалавекам. Падзеі адбываюцца ў паўднёва-ўсходняй Японіі, дзе ўлады рэдка рэагуюць у падобных сітуацыях. З пасажыраў у жывых астаюцца толькі шафёр Макота, Казуэ і Наокі (брат з сястрой), якія нядаўна страцілі бацькоў у катастрофе.

Пасля выратавання жыццё гэтых людзей змяняецца. Маладыя не ўмеюць знайсці сэнс свайго існавання, адхіляюць дапамогу сяброў, суседзяў. Толькі Макоту ўдаецца стаць апекуном, з якім Казуэ і Наокі нармальна гавораць. Каб зацерці сляды мінулага ўсе трое купляюць мікрааўтобус, на якім выбіраюцца ў падарожжа — а мае быць яно вызваленнем.

Паўліна Шафран

Фота Аляксандра Вярбіцкага

Незаселенае гняздо

Такіх краявідаў, з асірочанымі краевугольнымі слупамі стадолаў, якія даўней былі вартавымі скарбаў нашай зямлі-карміцелькі, ва ўсходняй Беласточчыне — шмат. Задзівіла мяне буславае гняздо ў такім незвычайным месцы.

Гэты здымак зроблены ў Шашылах. У 1972 годзе праведзена там камасацыю зямельных угоддзяў. Адзін гаспадар з аптымізмам глянуў у будучыню і стаў будавацца. Паставіў хлеў, стадолу, хату...

Нястомны бесцялесны час карпатліва абцяжарваў працавітыя рукі земляроба чарговымі гадамі. Штораз цяжэй было рабіць і стадола знепатрэбілася. Разабралі яе пакінуўшыя радзіму нашчадкі, асталіся і апусцелі хлеў і хата, якія ўжо і дзецям непатрэбныя.

На адным са слупоў збудаваў бусел гняздо. Пара пражыла тут адзін год, развяла маладых. А ў наступныя гады буслы тыя прыляталі, аглядалі сваю буслиную бацькаўшчыну, але больш на тым месцы чамусьці не сяліліся. Апусцела гняздо, як хлеў і хата побач. І буслы — крыху як людзі...

Аляксандр Вярбіцкі

Паплыве вада з кранаў

Трасцянка — адна з большых вёсак у Нарваўскай гміне на шляху з Беластока ў Гайнаўку. Тут у першай палове сакавіка г.г. адбыўся вясковы сход прысвечаны будове водаправода, у якім прысутнічаў войт гміны Якуб Садоўскі.

У сходзе, апрача жыхароў Трасцянкі, удзельнічалі таксама людзі, якія купілі тут сабе летнія домікі, а пражываюць пераважна ў Беластоку. Аказалася, што ахвотных правесці ваду было 98% уласнікаў сяліб. Не захацелі вады толькі тыя гаспадары, якія маюць свае артэзіянскія калодзежы. Правядзенне вады будзе каштаваць у сярэднім гаспадара 1 500 зл. Прадбачваецца, што ў трэцім квартале г.г. жыхары Трасцянкі будуць мелі ваду з кранаў. Варта тут сказаць, што гэтая вада будзе добрай якасці з вадакачкі, якая знаходзіцца каля вёскі Іванкі. Цяпер яна выкарыстоўваецца менш як у 50 працэнтах.

Мікалай Лук'янюк

Ці будзе кніжка?

Тэлекамунікацыя польская ў мінулым годзе выдала новую тэлефонную кніжку „Беласток 2002". Я, на жаль, не належу да тых шчасліўцаў, якія атрымалі гэтую кніжку. У Раённым праўленні тэлекамунікацыі ў Гайнаўцы, куды я быў падаўся аплаціўшы раней тэлефонны рахунак, мяне паінфармавалі, што кніжкі ўжо няма. Працаўнік тэлекамунікацыі ўсіх, каму яе не хапіла, заносіў у спісак ды паабяцаў, што калі толькі кніжку дадрукуюць, усе атрымаюць паведамленне. Мінуў ужо год, а нас ніхто не паведамляе прыязджаць за кніжкай. Праўду кажучы і год таму ніхто нас не перапрасіў за тое, што надарэмна з'ездзілі ў Гайнаўку за кніжкай. І тут хочацца спытаць, ці Тэлекамунікацыя польская ведае колькі мае падключаных тэлефонаў? Бо чаму ж адны атрымалі кніжку, а іншым не хапіла? І ўвогуле ці дадрукуюць тэлефонную кніжку, бо калі не, дык Тэлекамунікацыя павінна, на маю думку, перапрасіць сваіх горшых кліентаў і зняць абанементную аплату хаця б за два месяцы.

Мікалай Лук'янюк

Неабходны рамонт

У выніку вясенняга разводдзя дарогі настолькі раскіслі, што зараз віднеюць адны калдобіны ад машын. У Чаромсе вуліцы Спартовая і Вішнёвая патрабуюць неадкладнага рамонту. Не ўпамінаю ўжо аб бакавых вулачках, дзе сам д'ябал шыю скруціць можа. Сёлетні бюджэт гміны даволі сціплы і камунальная служба можа не справіцца з праблемай. У мінулым годзе гміна абмежавалася адно да выраўнання дарог грэйдэрам. Гэта не вырашае праблемы, паколькі дарога ўсё паніжаецца і пры дажджавым надвор'і ператвараецца ў калюжу. На маю думку, трэба было б калдобіны засыпаць гравіем і тады пускаць грэйдэр. Але для гэтай справы патрэбны большыя грошы. (ус)

Камп'ютэрнае абучэнне

Паводле дагавору Чаромхаўскай гімназіі з Агенцтвам рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ад 10 сакавіка г.г. пачалося камп'ютэрнае абучэнне для жыхароў гміны. Заняткі праводзяцца ў чатырох групах (па 26 слухачоў у кожнай).

— Ахвотных было намнога больш чым спадзяваліся, — гаворыць дырэктар гімназіі Ежы Шыкула. — У адзін дзень прад'явілі прапанову ўдзельнічаць больш ста чалавек. Прадбачваліся чатыры групы па дваццаць курсантаў, але прынялі дваццаць чатыры асобы больш. Агенцтва прызначыла 15 000 зл. на абсталяванне залы. За гэтыя грошы купілі чатыры камп'ютэры, дыяпраектар і экран. Абучэнне праводзіцца ў дзвюх ступенях: умеласць карыстацца камп'ютэрам на практыцы і выкарыстоўванне камп'ютэрнай тэхнікі і Інтэрнэта ў прафесіі земляроба. Пасля заканчэння абучэння слухачы атрымаюць адпаведныя пасведчанні. (ус)

Еўрасаюз, як ты мне мілы...

Гумку трэба мяняць

Некаторыя гаспадары на вёсцы, якія займаюцца гадоўляй малочных кароў, мыюць электрычную даілку і бітоны, якімі возяць малако ў злеўню, вадкасцю „Асе".

Вядома, што „Асе" забівае ўсе заразкі дакладна. Дык іншы і ў малако капне колькі кропляў. Яно не заўважыцца на скупцы, і за малачко заплацяць не па трыццаць грошаў за літр, а аж па восемдзесят, бо будзе яно чыстае, без заразак.

А што тое „Асе" шкоднае для здароўя? Дык жа гэта не сабе, а на продаж. Во толькі бяда, расказвае адна баба другой бабе, тое „Асе" дык гумку ў „баньках" так хутка праядае, што кожны год трэба яе мяняць.

Не, кажа другая, мусіць тое „Асе" не аплоціцца!

Падслухала Ада Чачуга

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2003 r. upływa 5 czerwca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

http://www.anekdotov.net/

— Толькі адзін кілішак віна ў дзень...

Факты і высновы

Разгубленасць

Міхаіл Гарбачоў здзіўляецца: кожны амерыканскі прэзідэнт хоча мець сваю вайну. Адначасова ўсе падкрэсліваюць, што з'яўляюцца праўдзівымі хрысціянамі.

Ах, Михаил, Михаил! Ты Америку покорил, а не можаш раскусіць каўбойскага нораву. Дык у іх на першым месцы стаіць сіла. Свая.

Настальгія

Станіслаў Тычынскі (RMF FM) сумуе па „крэсах": W wyniku polityki grubej kreski przeszliśmy do porządku dziennego nad tym, że towarzysze są w Sejmie, a nie w Berezie Kartuskiej. Tu jest ten błąd.

А нам у свой зорны час незабыўны цэнзар-грунвальдчык забараняў нават успамінаць гэтую мясціну. Даказваў, што яе выдумалі злосныя і няправедныя towarzysze.

Усё цячэ, усё мяняецца.

Рыжык

Бацька Радыё Марыя раскрыў тайну СМІ: Media bardzo lubią głupich. I przez media głupimi można sterować.

Ведае, што мовіць.

Сідар Макацёр

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм.

1. пузырыстая маса, якая ўтвараецца на паверхні вадкасцей, напр. піва, або на раз'юшаных вуснах = 56 __ 58 __ 57 __ 48 __;
2. гарачая пара года або міфалагічная рака забыцця = 54 __ 52 __ 24 __ 7 __;
3. вялікая вёска = 19 __ 34 __ 29 __ 13 __;
4. скошаная і высушаная трава або парыжская рака = 42 __ 18 __ 6 __ 21 __;
5. вузкая пагранічная палоска неўзаранай зямлі паміж палеткамі = 10 __ 39 __ 1 __ 44 __;
6. Уладзімір, расійскі прэзідэнт = 20 __ 26 __ 53 __ 46 __ 3 __;
7. вайсковае падраздзяленне між узводам і батальёнам = 12 __ 30 __ 43 __ 2 __;
8. мянушка або прозвішча найбольш вядомых украінскіх братоў-баксёраў = 49 __ 38 __ 55 __ 4 __ 25 __ 15 __;
9. птушка сямейства ястрабіных або прозвішча першага сакратара ПАРП з 1980-1981 гг. = 9 __ 50 __ 16 __ 8 __;
10. унутранае імкненне, цяга = 14 __ 23 __ 31 __ 41 __ 32 __ 51 __ 45 __;
11. гарадок і возера між Мядзелам і Свірам = 47 __ 11 __ 40 __ 36 __ 22 __;
12. фанабэрыстасць, ганарыстасць, напышлівасць = 35 __ 5 __ 27 __ 28 __;
13. перапончатакрылае насякомае з джалам = 17 __ 37 __ 33 __;

Ш

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 7 нумара

Кастра, старка, Сакрат, растка.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Дзень лясного перасвісту

Мядзведзь Сандар Жоржавіч на досвітку вылез з бярлогі асабліва рэзвы. Пацягнуўся ў праменнях веснавога сонейка. Штосьці яго, аднак, занепакоіла.

— Нейкая незвычайная цішыня. Чагосьці тут не хапае, — падумаў нясклада. Азірнуўся, кінуў вокам на хвойкі і дубы.

— Ага: ніводнага птаха. Ні адзін мне не спявае. Ну, што гэта такое?!

Вярнуўся ў бярлогу. Хлябнуў кварту мёду і пашлэпаў на сход уселяснога кіраўніцтва. На паляне чакалі ўжо члены сходу, пасвіствaючы кожны на сваю ноту, прыглушваючы невыносную лясную ціш. Найгучней дзьмуў у лыч дзік Свіналыч — штосьці ў стылі старой песні, якую толькі сам ён мог разгадаць.

Мядзведзь уступіўся на паляну.

— Ці-і-ха!!! — узвыў.

Той змешаны лясны перасвіст здаўся яму быць яшчэ горшым ад таямнічай цішы. У галаве ад тых гукаў памяшаўся яму ўчарашні мёд з толькі што хлёбнутым.

— У чым справа? Дзе мае ўсе салаўі? Дзе чыжык мой любы?

Кіраўніцтва, змоўкнуўшы, акінула вокам самое сябе. Дзяцел Стукач, бы на загад, зляцеў з суседняга дуба.

— Пеўчае птаства кудысьці разляцелася, зведаўшы, што чыжык паў.

— Як так гэта — „паў"? — не ўцяміў Сандар Жоржавіч.

— Ну, як... Узяў дый паў, — збянтэжана тлумачыўся дзяцел.

— Ага, паў. Якая непрыемнасць! А салаўі — чаму яны зляцелі?

— Ну, бо яны без нашага галоўнага чыжыка... могуць толькі трэліць. Трэляць, што ўжо не змогуць цёхкаць ды цірлікаць.

— Не можа так быць, — рашуча адказаў мядзведзь. — Найлепшы помнік, які можам паставіць чыжыку, гэта далейшае салаўінае цёхканне ды цірліканне. Не пагаджаюся на няцёхканне ды нецірліканне. Цёхканне ды цірліканне — наша ўселясная каштоўнасць. Выдаю загад, каб салаўі вярнуліся цёхкаць ды цірлікаць.

Стукач, не чакаючы апошняга слова Сандара Жоржавіча, паляцеў шукаць прапаўшых салаўёў. Тым часам мядзведзь надалей выдаваў загады.

— А дзеля ўвекавечання паўшага чыжыка ўстанаўліваю Дзень уселяснога цёхкання ды цірлікання. У першы дзень вясны кожнае стварэнне мае цёхкаць ды цірлікаць! Ну-у!

Мядзведзь, выдаўшы загад, поўны гонару, вярнуўся ў бярлогу. На паляне пад хвойкай засталася толькі Кацюша.

— Цірлікаць? Лёгка вам сказаць! А цёхкаць!

Вавёрка падняла да пысы арэшак. Пераламала яго напалову, выкалупнула ядро, з'ела, сціснула абедзве палавінкі, зубам у чубках прасвідравала дзіркі. Дзьмухнула. Ды ніякае цёхканне ці цірліканне з пасвісцёліка не дабывалася. Толькі „сьф", „сьф"...

— І што я, бедная, зраблю? Хоць ты, Кацька, пакаціся, а песняра не ўдасі!

МакХолад

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Жонка дырэктара ўваходзіць у ягоны кабінет ды засцігае яго з сакратаркай на каленях. Ён прыкідваецца, што не заўважыў госці і дыктуе:

— Таму неабходна дакупіць два крэслы.

* * *

Гаспадыня адкрывае дзверы маладой жанчыне:

— Выбачайце, ці ваш муж дома? — пытае наведвальніца.

— Няма. А што вам ад яго трэба?

— Хачу яму аддаць хустачку, якую ён мне ўчора пазычыў.

— А што: у вас быў насмарк?

* * *

Муж тэлефануе жонцы:

— Гэта ты, каханая?

— Я. А хто звоніць?

* * *

Кавальскі прыходзіць да лекара, каб атрымаць рэцэпт на падмацаванне памяці. Лекар пахіляецца над бланкам і мармыча:

— Ліха бяры назву гэтага лякарства, але як называецца тая хвароба, на якую ён перад хвілінай скардзіўся?

* * *

Між сяброўкамі:

— Уяві сабе, што Зоя навучыла свайго мужа есці з рук.

— Што ты скажаш! А чаму?

— Бо не любіць змываць посуд.

* * *

— Чаму хочаш выйсці замуж за вайскоўца?

— Бо ён прывучаны выконваць загады іншых.

* * *

Маладая жонка сустрэла мужа раіцца лекара, як зацяжарыць.

— Найлепш выехаць, — адказвае ўрач.

— Ды куды? Усюды так дорага, а грошай мала...

— Хаця куды-небудзь.

* * *

Пакупнік да прывабнай прадаўшчыцы:

— Хачу купіць маёй сяброўцы рукавічкі, ды не помню размеру...

— Гэта не праблема, — адказвае яна і падае сваю руку.

Пакупнік патрымаў руку і кажа:

— І яшчэ хачу ёй купіць ліфчык і трусікі.

Басовішча 2003

1. Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў запрашае прыняць удзел у агульнаэўрапейскім **уступным этапе адбору** XIV выпуску Фэстывалю Музыкі Маладой Беларусі „Басовішча 2003". Заявы ў выглядзе 30-хвілінных запісаў сваёй музыкі дасылайце па адрасе: 15-888 Białystok, ul. Wyszyńskiego 2/87 **да 1 чэрвеня 2003 году**. Дасланую музыку павінен прынамсі ў 75% складаць беларускі матэрыял. Да заяваў далучыце кароткую характарыстыку гурту і тэксты песьняў.

2. Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў аб'яўляе **конкурс на плякат** XIV Фэстывалю Музыкі Маладой Беларусі „Басовішча 2003". Праекты дасылайце **да 1 чэрвеня 2003 году** на вышэйпададзены адрас. Абвяшчэньне вынікаў конкурсу адбудзецца 14 чэрвеня 2003 г. Пераможца будзе ўзнагароджаны.

Падрабязнасці па тэлефоне (+48) 501 612 879 (Ілёна Карпюк), альбо па электроннай пошце: basvas@o2.pl

ISSN 0546-1960